

**Камедыя будзе жыць!**



**З бальнічнымі лепш не мухляваць**



**Спартсмены размаўляюць па-беларуску**

СТАР. 3

СТАР. 4

СТАР. 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ВЕРАСНЯ 2014 г. СУБОТА № 184 (27794) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ДОБРЫ ПРЫКЛАД РАЎНАПРАЎНАГА І ЎЗАЕМАВЫГАДНАГА ДЫЯЛОГУ

### Так Прэзідэнт Беларусі называе развіццё адносін паміж нашай краінай і Кітаем

**Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з першым намеснікам прэм'ера Дзяржсавета КНР, членам Пастаяннага камітэта Палітбюро ЦК КПК Чжан Гаолі, які ўзначальвае дэлегацыю, што прыбыла ўчора ў нашу краіну з трохдзённым візітам, паведамляе БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«Ваша краіна заўсёды з'яўлялася нашым надзейным партнёрам. Развіццё адносін з Кітаем было і застаецца стратэгічным прыярытэтам знешняй палітыкі Беларусі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, пра тое, што сувязі Беларусі і Кітая ўвесь час развіваюцца і мацнеюць, сведчаць дынаміка кантактаў і ўзровень дамоўленасцяў, дасягнутых у апошні час.

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь і Кітай зацвердзілі праграму развіцця ўсебаковага стратэгічнага партнёрства да 2018 года і стварылі міжурадавы камітэт па супрацоўніцтве, на які ўскладзена функцыя каардынацыі двухбаковых адносін.

«Развіццё гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва з'яўляецца найважнейшым кірункам сумеснай работы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Падчас сустрэчы таксама ішла гаворка аб маючым адбыцца візіце кітайскага лідара ў нашу краіну. Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін, як чакаецца, наведае Беларусь у хуткім часе. «Упэўнены, што да візіту ў Рэспубліку Беларусь Старшыні КНР Сі Цзіньпіна, які мы чакаем у найбліжэйшай будучыні, бакі напоўняць фармат беларуска-кітайскіх адносін канкрэтным зместам. Бо гаворка ідзе аб усебаковым стратэгічным партнёрстве», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што, хаця Беларусь і Кітай актыўна супрацоўнічаюць па многіх кірунках, яшчэ шмат нявыкарыстаных рэзерваў для развіцця кантактаў у галіне гуманітарнага супрацоўніцтва, адукацыі, навукі, культуры і турызму.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь мае намер цесна ўзаемадзейнічаць з Кітаем і на міжнароднай арэне.

Высокі кітайскі госць перадаў цёплыя словы прывітання і найлепшыя пажаданні ад Старшыні КНР Сі Цзіньпіна і прэм'ера Дзяржсавета Лі Кэцяна. Звяртаючыся да Аляксандра Лукашэнкі, Чжан Гаолі падкрэсліў: «Напярэдадні майго ад'езду Сі Цзіньпін сказаў, што вы яго вялікі сябар і я змагу размаўляць з вамі на любыя тэмы, абмяняцца думкамі па многіх пытаннях».

Чжан Гаолі адзначыў, што камфортна адчувае сябе на беларускай зямлі, і падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за сардэчны прыём кітайскай дэлегацыі.

**Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Пятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу **2 кастрычніка 2014 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

**Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 кастрычніка 2014 года з 9.15 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.**

■ Жамчужыны Айчыны

## НЯХАЙ ГУЧЫЦЬ ПАЛАНЭЗ!

### Сядзіба Агінскіх у Залессі адноўлена дзякуючы намаганням дзяржавы і праекту трансгранічнага супрацоўніцтва



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

СТАР. 3

ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль РАЖАНЕЦ, начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

***«Сацыяльна-дэмаграфічная сітуацыя ў рэспубліцы развіваецца такім чынам, што ў структуры насельніцтва доля пажылых людзей устойліва ўзрастае. Удзельная вага людзей, старэйшых за працаздольны ўзрост, да 2020 года дасягне 27%. Старэнне насельніцтва выяўляецца на фоне павелічэння сярэдняй працягласці жыцця, што абумоўлівае рост колькасці адзінокіх грамадзян. Так, на 1 студзеня 2014 года ўдзельная вага асоб, старэйшых за працаздольны ўзрост, у агульнай колькасці насельніцтва Беларусі склала 23,9%. У параўнанні з 2003 годам гэты паказчык павялічыўся на 2,6%. Што тычыцца каэфіцыента дэмаграфічнай нагрузкі, то ў 2003 годзе на 1000 чалавек працаздольнага ўзросту прыпадала 355 чалавек, старэйшых за працаздольны ўзрост, а на пачатак гэтага года — 403».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.09.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10570,00 | ■ |
| Еўра | 13480,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 273,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 819,38 | ▲ |

## Спектр пытанняў — шырокі

### Чарговае пасяджэнне саюзнага Саўміна пройдзе ў Мінску 21 кастрычніка

**Аб гэтым на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Беларусі Міхаілам Мясніковічам паведаміў дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота, паведамляе БЕЛТА.**

У парадак дня мерапрыемства ўключана каля 30 пытанняў. Яны ахопліваюць усе сферы дзейнасці Саюзнай дзяржавы, у тым ліку падвядзенне вынікаў праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, зацвярджэнне балансаў (уключаючы энергетычны). Таксама будзе ўзнята тэма ўласнасці і павінен быць зацверджаны праект новай праграмы па выкарыстанні высокатэхналагічнай інфармацыйнай тэхнікі для работы з вуглевадароднымі рэсурсамі. Акрамя таго, будзе закранацца ваенны аспект, звязаны з функцыянаваннем рэгіянальнай групоўкі войскаў. Важным пытаннем з'яўляецца адабрэнне бюджэту, які будзе зацвярджацца потым на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў.

Міхаіл Мясніковіч заявіў аб поўнай гатоўнасці беларускага боку да правядзення мерапрыемства.

## УЛАДАРЫ СЯЛА

**Маладая сям'я — пераможца рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла 2014» — прадстаўдзіць Беларусь на міжнародным конкурсе «Лепшая маладая сям'я СНД». Апошні пройдзе ў кастрычніку ў Арменіі.**





Фотаздымкі БЕЛТА.

Нагадаем, што ўпершыню папулярны маладзёжны праект «Уладар сяла» прайшоў у Глыбоцкім раёне. У 2008 годзе конкурс становіцца рэспубліканскім. А пачынаючы з 2012-га ён — у афіцыйнай праграме Рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі».

Фінал папулярнага конкурсу «Уладар сяла» праходзіць 27 верасня ў Гарадку — райцэнтры Віцебскай вобласці — у рамках абласных «Дажынак». У ім бяруць удзел шэсць маладых сем'яў — пераможцаў абласных этапаў.

Падчас конкурсу візітных картак «Вітаем па-беларуску!» канкурсанты пакажуць невялікія тэатралізаваныя замалёўкі аб адным з дзён жыцця сваёй сям'і, сямейных традыцыях, захапленнях, адпачынку... Дарэчы, абавязковай умовай конкурсу з'яўляецца прэзентацыя беларускага нацыянальнага касцюма з улікам асаблівасцяў рэгіёна, які сям'я прадстаўляе. У праграме таксама такія выпрабаванні, як: «Па дровы» (распілоўка бярвёнаў, колка і складванне дроў), «Бульбаш» (сартаванне бульбы), «Сялянскія прысмакі» (гатаванне дранікаў у паходных умовах), «Зжатая паласа» (трэба будзе звязаць і ўстанавіць саламяныя снапы)...

Па выніках шасці конкурсных выпрабаванняў і вызначаць пераможцу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### У ЕС пакуль не бачаць прычын, каб змякчыць санкцыі супраць Расіі

У Еўрасаюзе пакуль не бачаць прычын, каб змякчыць або зусім скасаваць санкцыі супраць Расіі. Напярэдадні краіны ЕС і «Вялікай сямёркі» заявілі, што калі дасягнутыя ў Мінску дамоўленасці не будуць выконвацца, то ў дачыненні да РФ увядуць новыя санкцыі. «Цяпер няма прычын мяняць што-небудзь у пытанні санкцый», — прыводзіць Financial Times словы еўракамісара па пытаннях гандлю Карла дэ Кухта. Нягледзячы на тое, што Еўрапейскай камісіі даручылі сфарміраваць прапановы з нагоды магчымага змякчэння забаронных мер, наўрад ці ЕК падтрымае такія дзеянні, дадаў ён.

### Украінцаў абавяжуць прайсці «курс маладога байца»



У Міністэрстве абароны Украіны выступілі за абавязковае праходжанне грамадзянамі «курсаў маладога байца». Адпаведную заяву, як перадае тэлеканал «112 Украіна», зрабіў саветнік міністра Аляксандр Данілюк. «Наша задача — максімальна прыцягнуць грамадзян да абароны краіны. Сёння мы гаворым пра тое, што кожны грамадзянін абавязаны прайсці двухмесячны «курс маладога байца», — адзначыў ён. Пасля трэніровак грамадзяне, як патлумачыў Данілюк, прымуць удзел у сістэме тэрытарыяльнай абароны. Пры ваенкаматах сфарміруюць адпаведныя падраздзяленні, іх удзельнікі будуць штогод праходзіць зборы. Раней саветнік кіраўніка МУС Украіны Антон Герашчанка выступіў за ўвядзенне ваенных курсаў для падлеткаў. Ён прапанаваў вучыць іх стральбе з 12-13 гадоў «і выхоўваць павагу да службы ў войску».

### Індыя і Кітай дамовіліся вывесці войскі са спрэчнай тэрыторыі

Індыя і Кітай пасля перамоў пагадзіліся адвесці войскі з памежных тэрыторый. Міністр замежных спраў Індыі Сушма Сварадж у кулуарах Генасамблеі ААН у Нью-Ёрку заявіла, што ваенныя вернуцца на пункты дыслакацыі ў наступны аўторак. «30 верасня вывад войскаў будзе завершаны. Я абмеркавала гэта з міністрам замежных спраў Кітая. Лічу, што гэта вялікае дасягненне», — сказала Сварадж.

ISSN 1990 - 763X

14184>

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Сяброўства з суседзямі зніжае рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў

У даследаванні навукоўцаў з Мічыганскага ўніверсітэта прынялі ўдзел 5276 чалавек (старэйшых за 50 гадоў), якія не мелі сардэчна-сасудзістых захворванняў. У пачатку праекта рэспандэнтам было прапанавана ацаніць сваіх суседзяў па шкале ад 1 да 7. У людзей, якія ацанілі сваіх суседзяў на сем балаў з сямі, рызыка развіцця сардэчнага прыступу была на 67% ніжэй у параўнанні з людзьмі, якія паставілі суседзям усяго адзін бал.



КОРАТКА

**Сярэдні памер пенсій па ўзросце ў жніўні гэтага года складаў Br2 млн 596,8 тыс., па інваліднасці — Br2 млн 296,1 тыс., па прычыне страты карміцеля — Br1 млн 688,5 тыс., сацыяльных пенсій — Br1 млн 226,8 тыс.**

25 верасня беларускія грацыі Меліціна Станюта, Арына Шарапа і Кацярына Галкіна сталі ўладальніцамі сярэбранай узнагароды ў камандным заліку на чэмпіянаце свету па мастацкай гімнастыцы, які праходзіць у турэцкім Ізміры. Залаты медаль заваявалі расійскія гімнасткі, а ўкраінская каманда паказала трэці вынік.

**XIII Фестываль мастацтваў імя вядомага кампазітара, народнага артыста Беларусі Мікалая Чуркіна пройдзе ў Мсціславе 27 верасня ў час святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 71-й гадавіне вызвалення Мсціслаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Беларуская чыгунка выдзеліць дадатковыя электрацягнікі для дастаўкі балельшчыкаў пасля адборачных матчаў чэмпіянату Еўропы-2016, якія 9 і 12 кастрычніка пройдуць на «Барысаў-Арэне».

■ Беражыце сябе!

## СВЯТЛО Ў ЦЕМРЫ

### Дробязь, якая восеньскім надвячоркам можа выратаваць жыццё



Фота Надзі БУЖАН.

**«Будзь заўважным!» — падказвае нам адзін са слоганаў прафілактычнага банара ад ДАІ, якіх так багата ў Мінску і іншых гарадах Беларусі. І асабліва гэтая парада актуальна зараз, калі цямнець пачынае рана, а вяртацца з працы прыходзіцца часам уздоўж магістраляў позна вечарам. Зразумела, у такіх сітуацыях засцерагчы сябе ад непрыемных нечаканасцяў можна з дапамогай флікера. Але многія і дагэтуль бачаць у лімонных кругляшах цацку для дзетак, а не элемент бяспекі. Пра тое, як правільна выбраць флікер, якая ад яго карысць, «Звязда» падрабязна распытала Ганну БАНАДЫК, старшага інспектара па асаблівых даручэннях упраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў.**

СТАР. 6

■ Рэгіён

# ГОРАД МАЛЕНЬКІ, АЛЕ ЎДАЛЕНЬКІ



**Сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёнаў прысвяціў сустрэчу з журналістамі старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК. Прэс-канферэнцыя праходзіла ў Чачэрску — на прыкладзе гэтага гарадка губернатар паказаў, якім чынам невялічкі населены пункт можа быць прыведзены ў належны выгляд. Увогуле, па выніках 8 месяцаў працы вобласць мае неблагія паказчыкі, хоць год пачынаўся зусім няпроста.**

**— Мы лічым, што ў сацыяльнай сферы максімальна трэба ўкладаць у тыя аб'екты, дзе будзе самая вялікая аддача. Важна, каб жыхары Гомельшчыны бачылі станоўчыя змены. Каб кожны ўкладзены рубель прыносіў не толькі эканамічную карысць, але і задаволенасць людзей, якія жывуць на гэтых тэрыторыях. У камунальнай гаспадарцы застаюцца вялізныя магчымасці скарачаць выдаткі. Да ўзроўню вялікіх гарадоў трэба падцягваць малыя, павышаць там узровень жыцця.**

## МАЛЫ БІЗНЕС З ВЯЛІКАЙ АДДАЧАЙ

— Малы бізнес сёння развіваецца ў вобласці дастаткова інтэнсіўнымі тэмпамі, хаця, канешне, хацелася б яшчэ хутчэй. Тры гады таму ад бізнесу вобласць мела 12% даходнай часткі бюджэту вобласці, а па выніках мінулага года — амаль 20%. Шмат добрых прыкладаў у малых гарадах, дзе паспяхова займаюцца вытворчасцю, паслугамі, будаўніцтвам. Напрыклад, на Нараўляншчыне 70% бюджэту напаўняецца за кошт малога і сярэдняга бізнесу. Прадпрымальнікі тут утрымліваюць усю сацыяльную сферу.

**Наша задача — максімальна прадаць тую маёмасць, якая не выкарыстоўваецца, і тую, што знаходзіцца больш за тры гады ў арэндзе. Калі людзі становяцца гаспадарамі маёмасці, яны хутчэй знаходзяць інвестыцыі.**

— Мы сёння робім усё магчымае, каб і надалей павялічваць колькасць невялікіх прадпрыемстваў. Адзін з асноўных кірункаў — продаж маёмасці. Наша задача — максімальна прадаць тую маёмасць, якая не выкарыстоўваецца, і тую, што знаходзіцца больш за тры гады ў арэндзе. Калі людзі становяцца гаспадарамі маёмасці, яны хутчэй знаходзяць інвестыцыі і больш актыўна развіваюць сваю справу. Таму кожныя тры месяцы мы будзем заслухоўваць на пасяджэнні аблвыканкама кіраўнікоў рэгіёна — па пытанні прыцягнення маёмасці ў абарот. Мы дамовіліся, што калі прадаецца аб'ект нерухомасці, то сродкі, атрыманыя ад яго продажу, застаюцца на тэрыторыі раёна. Сёлета Гомель прадаў маёмасці на суму больш за 100 млрд рублёў. Гэтыя сродкі застаюцца ў бюджэце горада. Чым больш бізнес удзельнічае ў рэальным сектары эканомікі, тым больш будзе адлічэнняў у бюджэт, тым больш можна ўкладаць у сацыяльную сферу, тым вышэй будзе ўзровень жыцця людзей, — падкрэсліў губернатар.

## САВЕТ ПА ІНВЕСТЫЦЫЯХ

Здараецца, што органы ўлады на месцах баяцца прыняць нейкае рашэнне, таму пры аблвыканкаме быў створаны Савет па прыцягненні інвестыцый, які ўзначаліў старшыня аблвыканкама. У яго ўваходзяць усе кіраўнікі ўпраўленняў і сілавых структур.

— Задача інвестара — прыйсці да нас і прадставіць дакументальна свой праект. 99% ідэй мы падтрымліваем. Рэгіёны Гомельшчыны за апошнія два гады пастаянна атрымліваюць рэспубліканскія ўзнагароды за развіццё бізнес-клімату. Вось і цяпер Чачэрск прызнаны лепшым горадам для бізнесу ў Беларусі (з колькасцю насельніцтва менш за 50 тысяч чалавек).

## ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ ПАЛЕССЯ

Апошнія 3 гады тыя аб'екты, якія ўключаны ў праграму развіцця Прыпяцкага Палесся, выконваюцца пераважна за кошт абласнога бюджэту. Аднак не ўсё так проста. Калі фарміравалася гэтая праграма, раёны выказалі вельмі шмат жаданняў.

— Таму мы некалькі разоў пераглядалі праграму, выкраслілі з яе нерэальныя аб'екты. Напрыклад, запланавана выдаткаваць 1,5 трыльёна на стварэнне двух паркаў у Нараўлянскім раёне. Сёння гэта азначае забраць грошы з бюджэту вобласці. Зрабіць гэта нельга, бо пацерпяць усе ўстановы культуры, адукацыі, аховы здароўя Гомельшчыны. На тое, што пачалі ўжо ствараць і што сапраўды патрэбна для палескіх раёнаў, мы з абласнога бюджэту сродкі выдаткоўваем. Магчыма, некаторыя аб'екты будзем заканчваць пасля 2015 года.

## НЕВЫПАДКОВЫ РЭКОРД

Гомельшчына сёлета атрымала рэкордны ўраджай каласавых культур — амаль 1 млн 300 тысяч тон зерня пры ўраджайнасці — 34,3 ц/га. Такога ўраджаю на тэрыторыі вобласці не было больш чым 20 гадоў. Яшчэ плануецца атрымаць 200 тысяч тон кукурузы. Сабранага збожжа будзе дастаткова, каб забяспечыць гэтым відам кармоў і жывёлагадоўлю ў грамадскім сектары аграрнай галіны эканомікі.

**Не трэба вялікіх грошай, каб давесці да ладу райцэнтр. Спачатку трэба брацца за тое, што магчыма зрабіць сваімі сіламі: дрэвы абрэзаць, інфраструктуру прывесці ў нармальны стан...**

— Спрацавала на нас не толькі надвор'е, але і тэхналогіі, работа, якая мэтанакіравана вялася ўсе апошнія гады. Тым не менш, патэнцыял нашай зямлі яшчэ не вычарпаны. Па выніках работы за мінулы год Буда-Кашалёўскі раён заняў першае месца на рэспубліканскім фестывалі-кірмашы. Па аб'ёме вытворчасці зерня ён і зараз у тройцы лідараў (разам з Рэчыцкім і Рагачоўскім раёнамі). Тут самы высокі валавы намалот — каля 130 тысяч тон. Вось гэта і паўплывала на выбар Буда-Кашалёва як сталіцы сёлетняга абласнога свята аграрыяў. Я ўсім старшыням райвыканкамаў кажу: «Станавіцеся пераможцамі, і тады ў вашым райцэнтры правядзём «Дажынкі».

## ДАРОГІ ВЯЛІКІЯ І МАЛЫЯ

— Нашы дарожнікі маглі б адрамантаваць за год-два ўсе нашы дарогі. Але ж для гэтага патрэбны сродкі. Уведзены падатак павінен прынесці сёлета 120-140 млрд рублёў, якія будуць накіраваны на развіццё дарог абласнога падпарадкавання і тыя, што рамантуюць камунальнікі. Дарэчы, сёння ў камунальнай гаспадарцы больш за 6 тысяч км дарог, з іх звыш 4 тысяч км — у сельскіх населеных пунктах. Многа ўкладаецца сродкаў, ёсць спецыяльная тэхніка. Я кантралюю гэтую тэму, але ўсё залежыць ад гаспадара, — падкрэсліў Уладзімір Дворнік. — Не трэба вялікіх грошай, каб давесці да ладу райцэнтр. Спачатку трэба брацца за тое, што магчыма зрабіць сваімі сіламі: дрэвы абрэзаць, інфраструктуру прывесці ў нармальны стан... Калі ёсць імкненне і намаганні, будзе і дапамога з вобласці. Грошы з абласнога бюджэту пойдуць на нешта прынцыпова новае, што дасць развіццё рэгіёну. У бліжэйшыя некалькі гадоў будзе выконвацца прынцып канцэнтрацыі фінансавых сродкаў для комплекснай рэканструкцыі раённых цэнтраў. Сёлета, напрыклад, мы давядзём да ладу Буда-Кашалёва, дзе пройдуць абласныя «Дажынкі». Ужо завершаны работы ў Чачэрску. А ў 2015 годзе на адпаведны ўзровень плануем вывесці інфраструктуру Жыткавічаў, Турава і Веткі. Наступны этап — Петрыкаў і Добруш.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара**

■

# КЛІМАТЫЧНЫ БАЛАНС

## Падчас саміта па клімаце Беларусь прадэманстравала сваю кампетэнтнасць і лідарства ў прыродаахоўнай дзейнасці



**Як расказала першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія Малкіна, кліматычны саміт у Нью-Ёрку дапамог яшчэ раз паказаць сусветнай супольнасці, што Беларусь — не толькі дружалюбная, але і развітая краіна, якая знаходзіцца на перадавых пазіцыях па ўкараненні экалагічна значных тэхналогій.**

— Падчас саміта мы прадставілі сваю пазіцыю, сваё бачанне далейшага развіцця адносін у рэгуляванні клімату на сусветным узроўні як абсалютна сталая, самастойная, у тым ліку і эканамічна, дзяржава, якая здольна не толькі пра нешта думаць і штосьці прапанаваць, але і актыўна рэалізоўваць свае ідэі, — адзначыла Ія Малкіна. — І прапановы генеральнага сакратара ААН Пан Гі Муна, а таксама кіраўнікоў дзяржаў пацвердзілі, што мы сапраўды трымаем руку на пульсе.

**Задача саміта ў Нью-Ёрку была ў тым, каб пабудаваць дыялог паміж рознымі кіраўнікамі дзяржаў (каб яны выйшлі з пэўнымі абавязацельствамі, з канкрэтнымі вынікамі сваёй дзейнасці), стаць стымулам да актывізацыі нацыянальных палітык у кліматычным кірунку.**

Калі ў дзяржавы ёсць разуменне праблемы, яна павінна мець магчымасць скарыстацца ўсімі тымі механізмамі міжнароднага дагавора, якія дазваляюць гэтае разуменне прымяняць на практыцы. Менавіта на такіх прынцыпах, як добраахвотнасць, усеагульнасць і справаздачнасць, павінен быць пабудаваны дагавор па клімаце, упэўнена першы намеснік міністра.

Праблема змены клімату ў той ці іншай ступені тычыцца ўсіх краін свету. Не выключэнне і Беларусь.

Як адзначыў галоўны навуковы супрацоўнік-каардынатар міжнародных праектаў РУП БелНДЦ «Экалогія» Іван Наркевіч, асноўнай прычынай змены клімату сусветная навуковая эліта бачыць у павелічэнні выкідаў парніковых газаў і выкліканым імі парніковым эфекце: «Вучоныя пакуль не могуць даць выразнае, адназначнае тлумачэнне гэтай праблемы, але тое, што ў гэтым працэсе ёсць уплыў і чалавека, несумненна». Па словах Паўла Шэрманава, намесніка начальніка ўпраўлення гідраметэаралагічнай дзейнасці Мінпрыроды, змена сусветнага клімату ў нашай краіне не прывяла да катастрафічных падзей.

— За перыяд гідраметэаралагічных назіранняў сярэдняя тэмпература ў нашай краіне вырасла на 1,1°С, з'яўляюцца перадумовы для ўзнікнення чацвёртай агракліматычнай зоны на поўдні, — расказаў спецыяліст. — І ў гэтым працэсе можна знайсці як негатыўныя, так і пазітыўныя моманты. Напрыклад, павышэнне тэмпературы выклікала актыўнае ўзнікненне на тэрыторыі Беларусі інвазіўных (чужародных) відаў раслін і жывёл. Аднак гэты ж працэс прывёў і да павелічэння вегетацыйнага перыяду і паніжэння спажывання паліўных рэсурсаў.

Сёння ў Беларусі дзейнічае Дзяржаўная праграма мер па змякчэнні наступстваў змены клімату на 2013-2020 гады. Яна прадугледжвае комплекс мерапрыемстваў па кліматычных назіраннях, па ўмовах адаптацыі да змены клімату, распрацоўкі нацыянальнай справаздачнасці ў сферы змены клімату. Не так даўно была праведзена значная даследчая праца па лініі Міністэрства лясной гаспадаркі і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па адаптацыі лясного комплексу да змены клімату.

— Сёння Беларусь актыўна і эфектыўна працуе над вырашэннем праблемы змены клімату ў вобласці энергетыкі — адной з самых галоўных крыніц выкідаў парніковых газаў, — дадаў Іван Наркевіч. — І вялікае значэнне ў гэтым працэсе мае развіццё альтэрнатыўнай энергетыкі.

На думку вучонага, Кіёцкі пратакол дапамог павярнуць сусветную супольнасць да ідэі рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў, змяншэння выкарыстання вугляроднага паліва і, галоўнае, да пошуку і выкарыстання ўзнаўляльных крыніц энергіі.

Як упэўнены Андрэй Піліпчук, начальнік аддзела рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Мінпрыроды, каб пазбавіць нашу краіну ад выкідаў, шкодных для здароўя людзей і прыроды і планеты ўвогуле, неабходна выкарыстоўваць тэхналогіі, якія аднолькава эфектыўныя як у дачыненні да забруджвальных рэчываў, так і для парніковых газаў. Зараз асноўныя «баі» павінны разгарнуцца на «смеццевым фронце»: рост выкідаў парніковых газаў ад камунальных адходаў сёння ідзе найбольш актыўна.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

■ Дарэчы

# СІНОПТЫКІ АДЗНАЧАЮЦЬ 90-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ

**Гідраметэаралагічная служба Беларусі мае багатую і слаўную гісторыю. Першае метэаралагічнае бюро, як цэнтральны орган будучай Гідраметслужбы, было створана ў нашай краіне менавіта ў 1924 годзе. А вось першыя інструментальныя назіранні былі зафіксаваны на тэрыторыі Беларусі ў пачатку першай паловы XIX стагоддзя.**

Сёння гідраметэаралагічную дзейнасць ажыццяўляюць ужо мноства структур: Рэспубліканскі гідраметэаралагічны цэнтр, цэнтр радыяцыйнага кантролю і маніторынгу навакольнага асяроддзя, а таксама абласныя і міжраённыя цэнтры. У іх складзе цяпер дзейнічае 35 метэаралагічных, 2 гідралагічныя, 9 спецыялізаваных, 8 авіяцыйна-метэаралагічных грамадзянскіх станцый, 99 рачных і 10 азёрных гідралагічных пастоў.

У апошнія гады актыўна ўкараняюцца новыя тэхналогіі гідраметэаралагічных назіранняў, ідзе тэхнічнае перааснашчэнне дзяржаўнай сеткі гідраметэаралагічных назіранняў з усталяваннем аўтаматычных датчыкаў і аўтаматызаваных метэаралагічных сістэм. Значна ўзрос міжнародны аўтарытэт гідраметэаралагічнай службы Беларусі. Яна з'яўляецца актыўным членам СМА, прымае ўдзел у многіх яе рабочых органах, нарадах, канферэнцыях і паспяхова ўдзельнічае ў шэрагу міжнародных праграм.

На ўрачыстым сходзе, прысвечаным 90-годдзю дзяржаўнай гідраметэаралагічнай службы, які прайшоў учора, супрацоўнікам Рэспубліканскага гідраметэацэнтра былі ўручаны граматы і аб'яўлены падзякі ад Мінпрыроды.

**Сяргей КУРКАЧ**

■


## ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Триумфстрой»,

**опубликованной в газете «Звязда» №173 (27783) от 12.09.2014 с учетом дополнения, опубликованного в газете «Звязда» №176 (27786) от 17.09.2014, по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями бытового обслуживания и гараж-стоянкой по ул. П.Глебки» (без инженерных сетей)**

ООО «Триумфстрой» информирует о внесении изменений в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» № 173 (27783) от 12.09.2014, с учетом дополнения, опубликованного в газете «Звязда» №176 (27786) от 17.09.2014, по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями бытового обслуживания и гараж-стоянкой по ул. П.Глебки» (без инженерных сетей):

**ВНЕСТИ СЛЕДУЮЩИЕ ИЗМЕНЕНИЯ:**

**Абзац** «Стоимость одного квадратного метра общей площади жилого помещения для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет 23 034 000 рублей, что эквивалентно 2200 долларам США по курсу НБ РБ по состоянию на 10.09.2014 г. Платежи по договору создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты. Стоимость 1 кв. метра жилого помещения в долларовом эквиваленте является фиксированной до окончания исполнения договора. Оплата цены объекта долевого строительства (квартиры) производится в размере 100% в течение двух банковских дней.»

**ЧИТАТЬ В СЛЕДУЮЩЕЙ РЕДАКЦИИ:**

«Стоимость одного квадратного метра общей площади жилого помещения для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет 23 034 000 рублей, что эквивалентно 2200 долларам США по курсу НБ РБ по состоянию на 10.09.2014 г. Платежи по договору создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты. Стоимость 1 кв. метра жилого помещения в долларовом эквиваленте является фиксированной до окончания исполнения договора. Предусмотрена система скидок.»

УНП 190465926



## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в населенных пунктах дер. Высокая Горка, дер. новое Житьё, дер. Прилепы Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | 30 октября 2014 года в 11.00, а/г Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, а/г Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 — площадь 0,2500 га, № 624883002101000086, дер. Высокая Горка. Лот № 2 — площадь 0,2225 га, № 624883002101000085, дер. Высокая Горка. Лот № 3 — площадь 0,1802 га, № 624883007601000050, дер. Новое Житьё (ограничение в использовании — земли, находящиеся в охранной зоне линий электропередачи) Лот № 4 — площадь 0,1806 га, № 624883007601000051, дер. Новое Житьё. Лот № 5 — площадь 0,2001 га, № 624883008301000433, дер. Прилепы (по генплану № 72) ограничение в использовании — земли, находящиеся в водоохранной зоне водного объекта |
| 5 | **Условие продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 — 80 000 000 рублей<br>Лот № 2 — 80 000 000 рублей<br>Лот № 3 — 80 000 000 рублей<br>Лот № 4 — 80 000 000 рублей<br>Лот № 5 — 150 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | дер. Высокая Горка — подъездная дорога<br>дер. Высокая Горка — подъездная дорога<br>дер. Новое Житьё — подъездная дорога<br>дер. Новое Житьё — подъездная дорога<br>дер. Прилепы (по генплану 72) — подъездная дорога |
| 10 | **Условие оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с земельными участками** | Среда в 10.00 |
| 13 | **Прием документов** | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 14 | **Окончательный срок приема документов** | 24 октября 2014 года в 17.00 |
| 15 | **Контактные телефоны** | 8-01776-44-636, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в БЕЛАРУСБАНКЕ, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.


■ Мы і свет

# ІНТАРЭС НА ДРУГІМ КРАІ ЗЯМЛІ

## Наша краіна з цікавасцю сочыць за інтэграцыйнымі працэсамі на паўднёвым усходзе кантынента



**Днямі ў сталіцы Лаоса горадзе Венцьяне завяршылася 35-я Генеральная міжпарламенцкая асамблея Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), у якой брала ўдзел і парламенцкая дэлегацыя Беларусі. Пра тое, што нашай краіне дае статус назіральніка пры гэтай арганізацыі, і чым увогуле цікавая для нас АСЕАН, «Звязда» распытала намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Віталя БУСЬКО.**

***— Віталь Леанідавіч, гэта ўжо чацвёрты ўдзел Беларусі ў Генеральнай міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН, пры чым вы асабіста ў якасці парламентарыя ўдзельнічаеце ў такім мерапрыемстве трэці раз. Што адрознівае сёлетні форум?***

— Сапраўды, Беларусь удзельнічае ў Асамблеі з 2011 года, калі атрымала пры гэтай арганізацыі статус назіральніка. За 4 гады нам удалося прыкметна развіць сувязі нашай краіны з асацыяванымі дзяржавамі Паўднёва-Усходняй Азіі. Дастаткова сказаць, што старшыні парламентаў Камбоджы, Лаоса, В'етнама, намеснікі старшынь парламентаў Малайзіі і Сінгапура наведалі Беларусь. Спікер ніжняй палаты нашага парламента Уладзімір Андрэйчанка наведаў з рабочым візітам В'етнам і Камбоджу.

Палітычныя кантакты плаўна перарастаюць у эканамічныя. Сёлета Лаос з рабочымі візітамі наведалі беларускія міністры замежных спраў і эканомікі. І калі ў В'етнаме ўжо даўно збіраюць аўтамабілі «МАЗ», то цяпер распачата зборка трактароў «МТЗ» у Камбоджы, дамоўленасць пра якую была дасягнута падчас абмену візітамі спікераў парламентаў дзвюх краін.

Што тычыцца сёлетняй Генеральнай асамблеі, то яна была юбілейнай — 35-й, але самае галоўнае ў тым, што Асацыяцыя дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі рыхтуецца да найважнейшага этапу — у наступным годзе яны падпісваюць дагавор аб заснаванні адзінай эканамічнай прасторы. І хоць у гэту прастору ўвойдуць толькі 10 краін блока, яна, напэўна, па сутнасці сваёй будзе падобная да Еўразійскага эканамічнага саюза.

Асноўная тэматыка сёлетняй Генеральнай асамблеі — умацаванне міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Удзельнікі асацыяцыі вельмі сур'ёзна ставяцца да працэсу інтэграцыі, ім прыходзіцца вырашаць шмат праблем. Надта ўжо адрозніваюцца гэтыя краіны па многіх параметрах. Напрыклад, колькасць жыхароў Сінгапура — 5 млн, а Інданезіі — больш за 250 млн. Тая ж Інданезія ў спісе краін па велічыні валавога ўнутранага прадукту пры пераліку па парытэце пакупной здольнасці займае 9-е месца (амаль $2400 млрд), а Бруней — 116-е ($30 млрд).

Агульная ж колькасць насельніцтва ўсіх 10 краін — 630 млн чалавек, тавараварот унутры асацыяцыі складае $3,3 трлн. Нездарма гэтае інтэграцыйнае аб'яднанне прыцягнула да сябе 7 вядучых эканомік свету — адных у якасці ўдзельнікаў, іншых — у якасці назіральнікаў. Сярод апошніх — Японія, Аўстралія, Карэя, Кітай, Індыя, Расія, Канада... АСЕАН разлічвае да 2020 года стаць адным з самых моцных інтэграцыйных аб'яднанняў планеты.

Першая праблема, якая сёння стаіць у асацыяцыі на парадку дня, — падцягнуць менш развітыя эканомікі да ўзроўню больш развітых. І якраз парламенты павінны адыграць у яе вырашэнні значную ролю. Бо перш за ўсё трэба ўніфікаваць заканадаўства. Мы прайшлі праз гэта, калі стварралі Саюзную дзяржаву, Мытны саюз, а цяпер ідзе падобная работа па стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза. Таму наш вопыт ім можа быць карысным.

Да таго ж дзяржавы Паўднёва-Усходняй Азіі зацікаўленыя не толькі ў больш цесным супрацоўніцтве адна з адной, але і ў выхадзе на іншыя рэгіёны, у Еўропу. І ў гэтым ім таксама могуць дапамагчы Беларусь і Расія — пакуль адзіныя еўрапейскія краіны сярод назіральнікаў.

***— Якім чынам наша дэлегацыя выкарыстоўвае пляцоўку Генеральнай міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН?***

— У рамках асамблеі існуе дыялог з краінамі-назіральнікамі. Гэтыя сустрэчы праходзяць у фармаце 10 плюс 1, калі Беларусь, напрыклад, прадстаўляе сябе ўсім удзельнікам Асацыяцыі. Спачатку я выступаю перад парламенцкімі дэлегацыямі дзесяці краін і агучваю наша бачанне далейшага супрацоўніцтва з АСЕАН, а потым кожная краіна гаворыць пра свае інтарэсы ў гэтым супрацоўніцтве.

Сёлета я атрымаў вельмі добрыя эмоцыі, бо ўсе дзесяць дзяржаў выказаліся пазітыўна. Асабліва В'етнам, Камбоджа, Лаос, Малайзія. Зацікаўленасць была і ў М'янмы, якая летась не брала ўдзел у дыялогу. Да таго ж спікер ніжняй палаты парламента М'янмы пацвердзіў свой намер наведаць Беларусь. Пацвердзіў жаданне наведаць нашу краіну і спікер парламента Брунея.

Беларусь стала вельмі пазнавальнай. Мне вельмі прыемна ўдзельнічаць у Генеральнай парламенцкай асамблеі АСЕАН, бо там ніколі не адчуеш адносін «малодшы брат» — «старэйшы брат», «багатая краіна» — «бедная», «вялікая» — «малая». Там толькі прагматычнае жаданне супрацоўнічаць.



Адзін з самых значных гістарычных і архітэктурных помнікаў Лаоса — Пха Тхатлуанг, «Вялікая ступа» — будыйскае рэлігійнае збудаванне, выява якога нават маецца на дзяржаўным гербе.

На гэтай пляцоўцы ўдаецца вырашаць і палітычныя пытанні, напрыклад, выпрацаваць агульную пазіцыю з тым жа В'етнамам напярэдадні чарговай Асамблеі міжпарламенцкага саюза. Ёсць магчымасць агучыць свой погляд на тыя або іншыя падзеі ў свеце. Ды і ўвогуле, гэты рэгіён яшчэ па старой памяці з савецкіх часоў з шанаваннем і добразычлівасцю ставіцца да Беларусі.

***— Чым Беларусь цікавая для далёкіх краін Паўднёва-Усходняй Азіі?***

— Гэтыя краіны пераважна сельскагаспадарчыя. Яны зацікаўлены ў нашай тэхніцы, але тут нам трэба ўлічваць, што ў гэтых краінах няма вялізных палёў, таму і тэхніка іх цікавіць не самых вялікіх памераў.

Вялікая цікавасць да беларускай адукацыі і навукі. Праўда, сярод назіральнікаў там ёсць Аўстралія, дзе кожны пяты навучэнец, які атрымлівае пасляшкольную адукацыю, нарадзіўся за мяжой. Але калі мы забяспечым у нашых ВНУ выкладанне на англійскай мове, то да нас таксама паедуць. Пасля вяртання я ўжо размаўляў пра гэта з рэктарам Беларускага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, дзе такое навучанне распачата.

Паўднёва-ўсходні азіяцкі рэгіён высока ацэньвае ўзровень нашых тэхналогій у здабыўнай прамысловасці, у зандзіраванні зямной паверхні. У землях гэтых краін яшчэ знаходзяцца мільёны мін, якія не знайсці з дапамогай звычайных прыбораў, а планы мінных палёў (асабліва гэта актуальна для Камбоджы) страчаны. Каштоўны для гэтых краін, клімат якіх вельмі залежыць ад мусонаў, і вопыт барацьбы з паводкай нашага Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Зразумела, адлегласць — гэта праблема. Лагістыка з гэтым рэгіёнам пакуль што развіта слаба. Але прадстаўнікі краін АСЕАН кажуць: прыходзьце да нас і працуйце. Чамусьці мы не ведаем адтуль ні кавы, ні чаю, хоць там вырабляюць лепшыя ў свеце віды зялёнага чаю.

***— Як працягваецца ваша асабістая праца ў гэтым кірунку пасля вяртання з Венцьяна?***

— Ужо адпраўлена справаздача кіраўніцтву краіны, як правіла, на яе падставе складаюцца даручэнні для ведамстваў і арганізацый. Вы павінны разумець, што парламентарыі працуюць паралельна з урадам. Напрыклад, у нас з Лаосам існуе міжурадавая камісія па супрацоўніцтве, і тут роля парламента — стварыць спрыяльнае для гэтага супрацоўніцтва асяроддзе: змякчыць падаткі, абараніць інвестыцыі, садзейнічаць кантактам паміж дзелавымі коламі.

Шмат размоў ідзе пра развіццё турызму ў гэтым рэгіёне. У бліжэйшай турыстычнай выставе ў Мінску возьмуць удзел турфірмы з Камбоджы і В'етнама. І тут вельмі запатрабаваны бязвізавыя паездкі на час тура. Туды і так пералёты дарагія, дык навошта яшчэ браць грошы за візу? Мы ратыфікавалі пагадненне аб бязвізавым рэжыме з Турцыяй, падпісалі такое пагадненне з Ізраілем, дык трэба і з В'етнамам — нашым стратэгічным партнёрам. А там ёсць што паглядзець: славутыя будыйскія храмы, пясчаныя пляжы даўжынёй у тры тысячы кіламетраў, цёплае мора, горы і джунглі...

Рэгіён гэты вельмі цікавы і перспектыўны. Мы будзем цяпер уважліва сачыць за працэдурай стварэння там адзінай эканамічнай прасторы. Падобнай праграмы па «падцягванні» партнёраў па аб'яднанні не было ў Еўрапейскім саюзе. Тым цікавей назіраць за поспехамі інтэграцыйных працэсаў АСЕАН.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

# ТРЫ ДНІ НА СОТНЮ ЭКСПАЗІЦЫЙ

## Музейныя экспанаты выехалі «ў свет»

**Свята захавальнікаў гістарычных і культурных каштоўнасцяў — нацыянальны форум «Музеі Беларусі» — пачалося напярэдадні ў Гомелі і абяцае багатую праграму аж на тры дні. Лічыць гэта святам толькі музейшчыкаў, можа, і не варта, бо любы цікаўны чалавек зможа ацаніць экспазіцыі 99 арганізацый і кампаній, звязаных з музейнай справай. А, вядома ж, кожны ўдзельнік форуму стварыў сваю прэзентацыю як належыць — з лепшага.**

Форум «Музеі Беларусі» праводзіцца ўжо другі раз (упершыню быў арганізаваны ў 2012 годзе ў Гродне) і лічыцца адной з галоўных культурных падзей Беларусі. Сталіца ўсходняга Палесся Гомель сёлета не толькі сустракае зацікаўленых наведвальнікаў, але і становіцца пляцоўкай для абмеркавання сур'ёзных пытанняў, якія наспелі ў сённяшняй музейнай дзейнасці.

Сярод прадстаўленых экспазіцый будзе праводзіцца конкурс і вызначацца пераможцы ў шасці намінацыях: «Лепшае навуковае праектаванне экспазіцыі», «Лепшае мастацкае праектаванне экспазіцыі», «Лепшая арганізацыя міжнароднай выставы», «Лепшая арганізацыя выстаўкі з уласных фондаў», «Лепшы музей па арганізацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці» і «Лепшае музейнае выданне». Сустаршынёй журы з'яўляецца дырэктар Дзяржаўнага Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу Міхаіл Піятроўскі.

«Форум праводзіцца з мэтай прэзентацыі музейнай справы як важнейшага адукацыйнага і выхаваўчага рэсурсу грамадства, а таксама для прыцягнення ўвагі наведвальнікаў, СМІ, прадстаўнікоў дзелавых колаў да музейнай справы. Гэты форум — унікальная магчымасць для таго, каб прааналізаваць і асэнсаваць тыя працэсы, якія адбываюцца сёння ў музейнай справе. Гэта выдатная пляцоўка, якая будзе прадстаўлена шырокаму колу грамадскасці. А таксама тым, хто працуе ў музейных установах нашай краіны, каб абмяняцца думкамі, практыкай і паглядзець, як музеі нашай рэспублікі далучаюцца да глабальнай інфармацыйнай прасторы», — пракаментаваў падзею намеснік міністра культуры Васіль Чэрнік.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

■ Фестывалі

# МУЗЫЧНЫ «ТУМАН» АЙЧЫННАГА ГАТУНКУ


Вадзім РЭПІН сыграе на скрыпцы Гварнэры.

**Свет павінен страсянуцца: на фестывалі Юрыя Башмета абяцаюць прэм'еру твора беларускага кампазітара. «Пры чым тут свет, калі фестываль у Мінску?» — падумаеце вы. Але ж менавіта такая заяўка зроблена арганізатарамі: СУСВЕТНАЯ ПРЭМ'ЕРА твора пад назвай «Туман» для сімфанічнага аркестра і аргана маладога беларускага кампазітара Вольгі Падгайскай. Учытайцеся: сусветная. І тут просіцца ўдакладненне: Мінск жа — часцінка Сусвету, кропка на карце свету, а фестываль носіць імя сусветнай «зоркі»... Гэта не проста прэм'ера. І тут сапраўды ёсць момант радасці: на гэтым музычным фестывалі, які ладзіцца ў Беларусі пад імем «зоркі» з іншай краіны, ёсць айчынны слухач, ёсць айчынныя ўдзельнікі-музыканты і нават прагучыць беларуская музыка. Праўда, як частка ў праграме канцэрта, у якім будуць выконвацца творы Сафіі Губайдулінай «Чаму?» для флейты, кларнета і струнных інструментаў і «Вершнік на белым кані» для аркестра і аргана. Выканаўца — сімфанічны аркестр Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Але гэта толькі 1 кастрычніка, і дзеля аднаго канцэрта ў Мінск завітае аўтар — Сафія Губайдуліна.**

На гэтым фестывалі наогул ці не самае цікавае тое, хто да нас прыязджае. Стаўка на імёны асоб, назвы вядомых калектываў. Напрыклад, 29 верасня на адкрыцці ў Белдзяржфілармоніі сыдуцца Літоўскі камерны аркестр разам з дырыжорам і скрыпачом (ён выступіць яшчэ і як саліст) Сяргеем Крыловым. З беларускага боку сола на фартэпіяна забяспечыць Расціслаў Крымер, які з'яўляецца мастацкім кіраўніком фестывалю Юрыя Башмета ў Мінску. Усе разам абяцаюць арт-перформанс, фактычна шоу — і гэта пад музыку Моцарта! Але нам прапануюць не толькі паслухаць, але і паглядзець — карціны сучаснікаў кампазітара. Цікава, напэўна. Але ўжо не паслухаеш музыку з заплюшчанымі вачыма. Так мультымедыятэхналогіі мяняюць уяўленне і адчуванне мастацтва.

Зрэшты, Моцарта без шоу (сімфонію №24 сі бемоль мажор), а таксама канцэрт для габоя з аркестрам Беліні выканае 4 кастрычніка камерата Каралеўскага аркестра Канцэртгебаў Амстэрдама. Дырыжыраваць будзе Аляксей Агрынчук, ён жа выканае сола на габоі.

Наконт сола. Адметны ў гэтым сэнсе канцэрт запланаваны на 5 кастрычніка. Разам з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь вядомы скрыпач Вадзім Рэпін (пераможца прэстыжнага конкурсу каралевы Елізаветы ў Бруселі), які цяпер з'яўляецца грамадзянінам Бельгіі (акрамя Расіі) і жыве цяпер у Швейцарыі і Італіі, выканае творы рускіх кампазітараў: Сяргея Пракоф'ева, Анатоля Лядава, Сяргея Рахманінава. Але трэба ісці слухаць выдатнага музыканта яшчэ і таму, каб пачуць гук скрыпкі Гварнэры дэль Джэзу. Хтосьці пойдзе паслухаць, як гучыць музыка, выкананая на адным з самых дарагіх інструментаў свету. Хтосьці пойдзе паслухаць музыку, якая гучыць непаўторна. Хтосьці пойдзе паслухаць музыку — і толькі яе, калі не трэба ніякіх спецэфектаў, а толькі ўнутраная чуллівасць і патрэба ў ёй, жывой, у наш час тэхнікі.

Музычнае мастацтва наогул вельмі жывое, гэтым і каштоўнае. Адзін і той жа твор у выкананні розных музыкантаў гучыць па-рознаму, нават у аднаго і таго ж артыста кожнае новае выкананне не атрымліваецца падобным на папярэднія. І не выключана, што творы віртуоза Паганіні сучасныя скрыпачы выканаюць не горш, а можа, і лепш, чым сам маэстра. Але ўявіце сабе: 24 капрысы Паганіні ў адным канцэрце выканае малады венгерскі скрыпач Антала Залаі (3 кастрычніка).

Яшчэ адно знаёмства — з піяністам. Брытанскі (паўночнаірландскі) музыкант Бары Дуглас (між іншым, пераможца конкурсу імя Чайкоўскага ў Маскве) выступаў у прэстыжных залах свету. У Мінску выканае творы Ёганеса Брамса, Роберта Шумана, Франца Шуберта.

І, вядома, Юрый Башмет. Заўсёды галоўнае імя на гэтым фестывалі, нягледзячы на тое, што з ім прыязджаюць «Салісты Масквы» — камерны ансамбль, адзначаны прэміяй «Грэмі». Канцэрт 7 кастрычніка, на закрыццё.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Арт-пляцоўка

# Тэатр чакае лідараў

## Форум «ТэАрт» пачынае іх выхоўваць

Удакладненне XXI стагоддзя: тэатр можа існаваць без вешалкі. А вось дакладна ён не можа існаваць без лідараў. Без тых, хто нараджае ідэі, шукае, як іх увасобіць, знаходзіць аднадумцаў, такіх жа апантаных справай, у якой галоўнае — размаўляць з людзьмі шляхам мастацтва, нешта ім даносіць. Так, каб не проста прагучала — каб запала ў душу надоўга.

Беларускаму тэатру (які сёння вельмі розны: ёсць традыцыйны рэпертуарны, ёсць незалежныя праекты і нават калектывы) лідараў не хапае. Не ў тым сэнсе, што іх няма наогул (у нас што ні тэатр — то асобы), а ў тым — што іх не бывае зашмат. Асабліва цікава, калі з'яўляюцца новыя, з нейкім сваім успрыманнем свету.

Таму сёння разам са стартам форуму — 27 верасня адкрываецца беларуская праграма спектаклямі «Па імені Гаспадзін» і «Шабаны» — абвешчаны набор у «Школу АРТ Лідара». Новы праект Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў выспеў з серыі майстар-класаў, якія праводзіліся ў папярэднія гады. Арганізацыя гэтай школы цалкам лагічная, калі ўзяць пад увагу колькасць тых, хто хацеў наведваць майстар-класы са славутымі рэжысёрамі, акцёрамі. І гэта былі людзі, якіх тэатр не проста цікавіў як мастацтва, а яны хацелі існаваць у ім прафесійна, бачылі яго часткай жыцця.

У суботу першая з сустрэч у рамках «Школы» пройдзе ў арт-прасторы «Цэх» з тэатральным крытыкам Рэнатай Клет, якая збіраецца распавядаць пра розныя кірункі і творчыя манеры ў сучасным нямецкім тэатры. Далей адбудуцца сустрэчы з Кірстэн Дэльхольм з Даніі, дырэктарам тэатра «Атэль ПраФорма», рэжысёрам і сцэнарыстам з правакацыйнай лекцыяй «Я не люблю тэатр». Майстар класы па культурным менеджменце правядуць Іаана Мікульска і Агнешка Паянчкоўска з Польшчы. Аўтар кнігі «Тэатр эпохі перамен у Польшчы, Венгрыі і Расіі. 1990-2010 гады» Наталля Якубава будзе тлумачыць, ці мае права на існаванне паняцце «Тэатр Усходняй Еўропы». І што актуальна для сучаснага свету: размова аб праве інтэлектуальнай уласнасці ў тэатральнай дзейнасці. Дзеля гэтага нават запланаваны «круглы стол».

І не менш важная частка тэатральнай адукацыі — непасрэдна прагляд спектакляў майстроў, якія да нас прыедуць з творамі і нават будуць гатовы да кантакту з публікай. І першае, і другое бывае непаўторна. Разумееш, што тэатр — гэта частка жыцця. І гэта само жыццё, адна з яго праяў. Чароўная. Часам рэзкая. Бескампрамісная. Уражлівая. Можа ўводзіць у шок. Адкрываць патаемнае. У свеце. У людзях. У табе. Таму ўсё ж — найперш чароўная.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Прэм'ера

# У ВЕНЕЦЫІ НЕ КАХАЦЬ НЕМАГЧЫМА

## А каго (ці што) любіць — ужо пытанне

**Спектакль дэль артэ «Viva commedia!» («Няхай жыве камедыя!»), прэм'ера якога толькі-толькі прайшла ў драматычным тэатры імя Горкага, па ўсіх паказчыках павінна была стаць максімальна набліжанай да сапраўднай італьянскай камедыі і традыцыйным для камедыі масакдэль-артэ тыпам сюжэтных перыпетый. Калі да стварэння спектакля датычныя італьянцы — рэжысёр Матэа Сп'яцы і драматург Рыкарда Піпа. Не-не, сам спектакль гучыць на рускай мове, і акцёры «горкаўскія», і жарты зразумее беларускі (часам толькі беларускі) глядач.**


Закаханая (Іна САВЯНКОВА).

Да «Viva commedia!» варта ставіцца як да выключна забаўляльнага спектакля. Актуальныя жарты, сучасныя персанажы (Марадона, чарапашкі-ніндзя) і імёны Вера, Надзя і Люба ў вуснах герояў паспяхова суседнічаюць са стылізаванымі касцюмамі, песнямі на італьянскай мове і імёнамі традыцыйных персанажаў камедыі дэль артэ. Гэта стары Панталоне, улюбёны ў свой куфар з грашыма, Доктар, закаханы ў дачку Панталоне Ізабэлу, якая закахана ў невядомага ёй удзельніка карнавала. Яшчэ ёсць сын Доктара Чынцыа (Закаханы), які, вярнуўшыся ў родную Венецыю, закахаўся ў нявесту свайго бацькі. Ёсць Капітан, улюбёны ў свайго каня, якога вымушаны быў пакінуць у ламбардзе. Ну і куды ж без рознага роду персанажаў-слуг? Разумны і знаходлівы Арлекіна, закаханы ў служанку Панталоне Каламбіну (а Каламбіна закахана ў Арлекіна) і Дзані — дурны слуга Капітана.

Анатацыя не хлусіць — у гэтым спектаклі сапраўды ўсе закаханыя, і калі на паперы хітраспляценні спектакля здаюцца складанымі, на справе гэтая насычанасць і маляўнічасць напружыць не здольна. Дзеянне развіваецца, цалкам захопліваючы гледача яркімі жартамі, сцэнамі і новымі персанажамі. «Viva commedia!» раскрываецца не адразу — з таго моманту, як спектакль пачынаецца сваркай Панталоне з Каламбінай, незнаёмыя гледачу героі сваім з'яўленнем прымушаюць шукаць у іх хібы, каб з палёгкай адчуць ноты сарказму.

З Панталоне ўсё ясна з першага моманту, з крыку небаракі Каламбіны, якую той выганяе на начную вуліцу Венецыі, падазраючы яе ў крадзяжы. Каламбіна ж не скупіцца на словы, але гэта далёка не вулічная лаянка, а рэплікі, поўныя дыхтоўнага сарказму і простанароднай эмацыйнасці. Куфар з манетамі — адзіная любоў старога Панталоне, таму ён ніколі не ператворыцца ў пасаг для адзінай дачкі Ізабэлы.

Пузаты псеўдавучоны Доктар са сваім каханнем да Ізабэлы прыйшоўся якраз дарэчы: яму не патрэбна жонка з пасагам, за вясельнае меню ён можа заплаціць сам. Доктар пацешна «ўключае логіку», здольны ментальна засыпаць і ні кроку не можа ступіць без падобнай на слоўнік вучонай кнігі, дзе шукае тлумачэнні слоў накшталт «хворы».

Прыгожая Ізабэла, дачка Панталоне, пачцівая, ветлівая, навучаная манерам, яна далікатна прытрымлівае сваю сукенку ў прысутнасці бацькі і Доктара, але варта ім пайсці — спадніца свабодна падае і дэманструе круглы жывот: сустрэча з незнаёмцам на карнавале не прайшла дарма.

Апярэджваючы глядацкае ўражанне, магу сказаць, што больш за ўсё пасажаў варта чакаць ад персанажа Закаханага. Ігра акцёра (на прэм'еры Чынцыа выконваў Уладзімір Глотаў) бліжэй за ўсіх да дэльартаўскай імправізацыі і дастаўляе акцёру прыкметнае задавальненне. Глядач гэта адчувае: Чынцыа не крыўляецца, не стараецца сканцэнтраваць увагу на сабе — ён у гэтай ролі жыве і жыве з натуральным камфортам, пад добры настрой.

Што характэрна: у камедыі дэль артэ персанажы-слугі самадастатковыя побач з персанажамі гараджан. Іх шматлікасць у гісторыі італьянскага тэатра ўжо ў XVI стагоддзі зрабіла слуг раўнапраўнымі ва ўвасабленні чалавечых характараў. Сакавітасцю характараў цямлівы Арлекіна, дурны Дзані, простая і закаханая Каламбіна не саступаюць сваім гаспадарам.


... і закаханы (Уладзімір ГЛОТАЎ).

Жанр дэль артэ для беларускіх тэатраў не новы, хоць гучныя словы дзе-нідзе чуюцца, маўляў, «у Беларусь нарэшце прыйшло новае ды ўнікальнае». Жанр камедыі масак («майстэрскага тэатра», тэатра імправізацыі) даўно выйшаў за рамкі проста італьянскага здабытку і стаў жанрам сусветнага тэатральнага мастацтва, якое час ад часу прываблівае і беларускіх пастаноўшчыкаў. Трагедыю ж ніколі не называюць грэчаскім жанрам, а пры пастаноўцы камедыі наогул не ўспамінаюць грэка Арыстафана (бацькі літаратурнай камедыі).

Камедыя масак для італьянцаў — прыкладна як выступленні скамарохаў: вулічны тэатр, яркія касцюмы, жарты, імправізацыя, песні, скокі, кантакт з публікай, дзе галоўнае — забава і завуаляваная рэакцыя на свет сённяшні (хутчэй таму, што бура смеху ад актуальных жартаў больш магутная). І росквіт для абодвух тэатраў прыпаў прыкладна на адзін час (хоць скамарохі пачалі скакаць ужо ў XI стагоддзі, а дэль артэ існуе з XVI). Але сутнасць не ў гэтым, галоўнае — тэатры народныя, забаўляльныя і імправізаваныя.

У «Viva commedia!» любыя падзеі адбываюцца лёгка і як быццам натуральна. Зацяжарыла ад незнаёмца на карнавале? Дробязь, гэта ж страсная Італія. Вырашыў выдаць адзіную дачку замуж за дурнога старога доктара? Нічога страшнага, гэта разважлівая Італія. Закахаліся адно ў аднаго пасля адзінай начной размовы з вокнаў суседніх дамоў? Раз плюнуць, гэта закаханая Італія. Прычым Італія такая простая, даступная, зразумелая беларускаму гледачу і нават блізкая. Падумаеш, цяжарнасць! Маралістам уставіць няма чаго, таму што сюжэт з добрымі жартамі (над якімі даводзіцца смяяцца ў голас) адкідае ўсе прэтэнзіі.

Адным са складнікаў гумару спектакля «Viva commedia!» стала якраз сумяшчэнне дэталяў беларускай рэчаіснасці з італьянскай асновай. Капітан і Дзані рэпетуюць уцёкі з краіны з куфарам грошай і на мытні кажуць «лабас вакарас» (добры вечар па-літоўску), затым нейкія гукаперайманні, падобныя да польскай мовы...

**Зацяжарыла ад незнаёмца на карнавале? Дробязь, гэта ж страсная Італія.**

Другім складнікам стала камедыя становішчаў. Ну, прапануе Панталоне ў якасці ўзнагароды не грошы са свайго запаветнага куфара, а ўнучку ў пялёнках. Камедыя праяўляецца і ў знарочыстай нядбайнасці жэстаў. Рухі цела ў дэль артэ — наогул асобная гісторыя, але што тут казаць — бачыць трэба.

Супрацоўніцтва італьянцаў з беларусамі дзеля стварэння тэатральнай камедыі невыпадковае. Італія старшынствуе ў Еўрасаюзе, у сувязі з чым праводзіць культурную праграму. Пасольства напружылася, пацягнулася па прыемныя ўспаміны пра дом і ўзялося за традыцыйную італьянскую справу — асвету. Прыцягнулі італьянскіх культурных дзеячаў, перакладчыкаў, энтузіястаў, раскінулі мазгамі: чым можна на беларускай платформе беларусаў і з беларусамі захапіць? У зайздросна багатай культуры Італіі было з чаго выбіраць. Бо Італія — не проста Мікеланджэла Буанароці (што мае на ўвазе астатніх дзеячаў эпохі Адраджэння), Мікеланджэла Антаніоні (са спасылкай на італьянскае кіно «Кабірыя») і Антоніа Вівальдзі (уявіце спіс італьянскіх кампазітараў). Але і, Божа ж мой, незлічоная колькасць культурных здабыткаў, у якіх можна патануць (нездарма Італія з рознымі прыназоўнікамі і выклічнікамі стала любімым «брэндам» снобаў). А між тым згубіцца можна і ў той красе імёнаў уласных, якія тут ужо прагучалі.

Дарэчы, культурная праграма пасольства Італіі абяцае зрабіць акцэнты і на жывапісе, і на кіно, і на італьянскай мове. У якой форме — даведаемся з часам. А да гэтага — карты так склаліся — Матэа Сп'яцы і Рыкарда Піпа (рэжысёр і драматург спектакля «Viva commedia!», нагадваю) праводзілі майстар-класы для беларускіх артыстаў у Мінску. Ідэя-фікс не прымусіла сябе чакаць: у гэты час вырашана было паставіць на беларускай сцэне і з беларускімі акцёрамі спектакль у традыцыйным італьянскім жанры.

Ці стала «Viva commedia!» сапраўднай італьянскай камедыяй дэль артэ? Падобна, і не збіралася, але ўсё лепшае ад камедыі масак усё ж узяла: якасны гумар і смех у сюжэтных перыпетыях, эмацыйная гульня акцёраў, сарказм у падыходзе да абмалёўкі персанажаў, прастата выкладання мудрагелістага сюжэту і, што важна, — лёгкае стаўленне да жыцця з пастаянным усведамленнем: усё дакладна будзе добра. Спектакль уключаны ў рэпертуар драмтэатра, таму трапіць на яго можна яшчэ неаднойчы, а паўтору, я ўпэўнена, захочацца.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

# НЯХАЙ ГУЧЫЦЬ ПАЛАНЭЗ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**25 верасня, менавіта ў дзень нараджэння дыпламата, гісторыка, пісьменніка і кампазітара, аўтара славутага паланэза «Развітанне з Радзімай» Міхала Клеафаса Агінскага, старадаўняя ліпавая алея да яго радавога маёнтка, якая памятае конныя экіпажы гаспадароў сядзібнага дома і іх сяброў і знаёмых, зноў убачыла шмат гасцей, людзей самага рознага ўзросту. Адбылася доўгачаканая падзея: сядзіба Агінскіх на Смаргоншчыне, якой, як і многім іншым гістарычным аб'ектам, не пашчасціла пазбегнуць разбурэння і заняпаду, нарэшце адноўлена.**

Гэта зроблена дзякуючы фінансавым сродкам рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама міжнароднай супольнасці ў рамках праекта «Выкарыстанне гістарычных сядзіб і іх адаптацыя да сучасных культурных умоў», які Смаргонскі райвыканкам і Тракайскі нацыянальны парк ажыццявілі ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Латвія — Літва — Беларусь», працы землякоў Міхала Клеафаса Агінскага са Смаргонскага будаўніча-мантажнага трэста №41 і спецыялістаў «Белрэстаўрацыі» .

Ва ўрачыстасцях з нагоды адкрыцця пасля рэканструкцыі музея-сядзібы Міхала Клеафаса Агінскага ў Залессі ўдзельнічалі міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў, былы старшыня Смаргонскага райвыканкама, а цяпер мэр Гродна Мечыслаў Гой, ганаровы грамадзянін Смаргонскага раёна Уладзімір Шчасны, многія мясцовыя жыхары і госці з іншых рэгіёнаў. Яны ўбачылі тэатралізаванае дзейства з перадачай сімвалічнага ключа ад сядзібы Міхалам Клеафасам Агінскім нашым сучаснікам, азнаёміліся з музейнай экспазіцыяй, якая пачала стварацца, паглядзелі спектакль «Паланэз на развітанне» ў выкананні Мінскага абласнога драматычнага тэатра. А завяршыліся ўрачыстасці канцэртам камернай музыкі «Вяртанне Паўночных Афін» Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Прагучалі творы Агінскага ў розных музычных жанрах, а завяршыўся канцэрт, вядома ж, знакамітым паланэзам «Развітанне з Радзімай».

Дарэчы, у сумесным праекце беларускае Залессе і літоўскі Ужутракіс, маёнткі Агінскіх і графа Тышкевіча, паядналіся невыпадкова. Калісьці прадстаўнікі вядомых магнацкіх родаў былі суседзямі, сустракаліся, уплывалі на культурнае жыццё рэгіёна. А цяпер партнёрскія сувязі наладжаны іх нашчадкамі. Прычым праект быў скіраваны не проста на рэстаўрацыю канцэртнай залы ў Залессі, абсталяванне яе стылізаванай пад тую эпоху мэбляй (яе вырабілі ў Бабруйску), набыццё раяля. Як зазначыў Уладзімір Шчасны, няхай і немагчыма сёння поўная архітэктурная аўтэнтычнасць сядзібнага дома, але трэба імкнуцца да таго, каб ён стаў сапраўдным культурным цэнтрам, як пры жыцці Міхала Клеафаса Агінскага. Вопыт у гэтым кірунку на Смаргоншчыне ёсць. Ужо традыцыйна праводзяцца фестываль-кірмаш «Залессе запрашае сяброў», міжнародны фестываль камерных ансамбляў імя Міхала Клеафаса Агінскага. Наступны музычны конкурс з удзелам выканаўцаў з розных краін адбудзецца ўжо ў адноўленай канцэртнай зале ў Залессі ў 2015-м у гонар 250-годдзя з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага. Гэты юбілей уключаны ЮНЕСКА ў каляндар памятных дат.

Наперадзе — новыя справы на тэрыторыі сядзібы. У прыватнасці, патрабуюць вырашэння праблемы парку, водных аб'ектаў. Мяркуецца, што на гэта будзе скіраваны чарговы сумесны праект смаргонцаў з літоўскімі партнёрамі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

*Ва ўладанне роду князёў Агінскіх Залессе (тады — Дзербы) перайшло ў першай палове XVIII стагоддзя, калі гэты маёнтак набыў прадзед Міхала Клеафаса — Марцыян Міхал. Пазней ён перайшоў да яго сына Тадэвуша Францішка, потым — да Францішка Ксаверыя Агінскага. Пляменнік апошняга Міхал Клеафас Агінскі прыехаў у Залессе з жонкай Марыяй Неры-Нагурскай. Яны засяліліся ў вялікі драўляны атынкаваны палац, пабудаваны яшчэ ў першай палове XVIII стагоддзя (да нашага часу ён не захаваўся), а побач пачалі ўзводзіць новы, мураваны, а таксама двухпавярховы млын, аранжарэі і цяпліцы, капліцу. Праекціроўшчыкам быў прафесар архітэктуры Віленскага ўніверсітэта Міхал Шульц. Дапамагаў яму (а пасля смерці Шульца кіраваў усімі работамі) віленскі губернскі архітэктар Юзаф Пусэ.*

*Аднак у канцы 1822 года Міхал Клеафас па стане здароўя пакідае сваё любімае Залессе і пераязджае ў Фларэнцыю, якая і стала для яго апошнім прытулкам. У 1833 годзе маёнтак перайшоў у спадчыну яго сыну Ірэніушу, які жыў тут са сваёй маці, а пасля яе смерці перанёс радавую рэзідэнцыю Агінскіх у горад Рэтаў (тэрыторыя сучаснай Літвы). Ужо ў канцы XIX стагоддзя ў былых Паўночных Афінах (такую назву Залессе, дзе збіраліся выдатныя дзеячы той эпохі з Пецярбурга, Масквы, Парыжа, Варшавы, Вільні і іншых гарадоў, атрымала ад сучаснікаў Міхала Клеафаса) панаваў дух запусцення...*

*У 2009 годзе помнік гісторыка-культурнай спадчыны (тэрыторыя сядзібы складае 25 гектараў) быў перададзены ва ўласнасць Смаргонскага раёна з дакументацыяй на рэстаўрацыю.*


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# СКАНДЫНАВЫ — КАРАЛІ ДЭТЭКТЫВАЎ

**Папярэднічаць эстэцкай праграме кінафестывалю «Лістапад» будзе фестываль скандынаўскага кіно, які пройдзе ў кінатэатры «Перамога».**

Праграма з пяці фільмаў вытворчасці скандынаўскіх краін — Швецыі, Даніі, Нарвегіі — адкрыецца ў панядзелак 29 кастрычніка фільмам-біяграфіяй «Вальс для Монікі» пра культавую джазавую спявачку Моніку Сатэрлунд.

Акцэнт фестывалю скандынаўскага кіно зроблены на тых карцінах, якія зняты ў любімых скандынавамі жанрах — дэтэктыва і меладрамы.

«Аб любві да гэтых жанраў у суровых нардычных народаў можна даведацца нават па бестселерах на прылаўках кніжных крам. Скандынавы сталі каралямі сучаснага крымінальнага жанру. Кіно гэта пацвярджае, і вялікая частка праграмы зроблена менавіта з дэтэктываў: экранізацый кніжных бестселераў і тых аўтараў, якія, можа быць, мала знаёмыя нашай публіцы, але ў Скандынавіі па папулярнасці дасягаюць узроўню Агаты Крысці і іншых, не менш масцітых, аўтараў, — каментуе праграмны **дырэктар абодвух кінафестываляў Ігар СУКМАНАЎ.**

Назвы фільмаў з праграмы фестывалю «Злачынствы страсці» і «Забойства каля мора» абяцаюць задавальненне ад экранных авантур. У праграме фестывалю ёсць і экранізацыя рамана «Вікторыя» нобелеўскага лаўрэата, класіка Кнута Гамсуна — фільм «Вікторыя. Гісторыя кахання» Торуна Ліяна.

«Нам хацелася б падкрэсліць, што ёсць вялікая колькасць якаснага жанравага кіно, якое можа паслужыць лекамі ад нуды. Мы не ставілі мэтай уразіць гледача эстэцкімі «наваротамі», але ў першую чаргу — дазволіць публіцы добра правесці час і атрымаць сапраўднае задавальненне.

Кожную з карцін запусцяць па традыцыйнай пракатнай схеме, не абмяжоўваючыся адным-двума паказамі. Схема пракату фільмаў-удзельнікаў будзе мяняцца і на «Лістападзе».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

■ Восеньскі гандаль

# У БАБУЛЬ НЕ ЗАЎСЁДЫ ТАННЕЙ

**У Віцебску можна купіць садавіну і агародніну на імправізаваных вулічных кірмашах. Але няма гарантыі, што агуркі ці бульба там таннейшыя, чым у крамах.**




Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Каб параўнаць цэны, спачатку зайшоў у фірменную краму СВК «Альгоўскае», што — на вуліцы Люднікава. Кілаграм бульбы прадавалі за 4050 рублёў, морквы — за 4700, 1 кіло цыбулі рэпчатай — за 6700 рублёў, часнаку свежага з Кітая — за 34300 рублёў, буракоў — за 5150 рублёў, капусты — 3500 рублёў (квяцістай — за 17450 рублёў). Гандлярка сказала, што беларускі часнок наогул не прывозяць…

На скрыжаванні вуліцы Смаленская і праспекта Фрунзэ (на апошнім, дарэчы, знаходзіцца летні амфітэатр. — **Аўт.**) гандлявалі як з «колаў», так і з палатак. Мужчыны прывезлі на «газелі» бульбу, якую прапаноўвалі купіць за 3,5 тысячы кіло, а дробную — нават за 2 тысячы. Яны ж рэалізоўвалі баклажаны па 13 тысяч рублёў за кіло, перац — па 9 тысяч, таматы зялёныя — па 4 тысячы рублёў і нестандартныя (менавіта так было напісана. — **Аўт.**) — па такой жа цане.

Побач фермер рэалізоўваў бульбу ў мяшках па цане 3,5 тысячы за 1 кг. Сказаў, што прымае заказы і ўвечары можа прывесці бульбу пакупніку. Недалёка кабета прадавала мёд некалькіх гатункаў: прасіла 50 тысяч рублёў за паўлітровы слоік.

Дайшоў я і да «бабак». Такі «брэнд» («бабкамі» называюць пажылых жанчын, што гандлююць агароднінай і іншым на вуліцы), напэўна, ёсць у кожным горадзе. Бабуля вельмі прасіла купіць галоўку часнаку за 3 і 4 тысячы рублёў (у залежнасці ад памеру), а невялічкую — увогуле за 1 тысячу. Пенсіянерка, якая стаяла насупраць, за 5-літровае вядро бульбы прасіла 25 тысяч рублёў. Яе суседка па вулічным гандлі прадавала кукурузу вараную — усяго 2 тысячы за штуку. Дзед прасіў 16 тысяч рублёў за кіло агуркоў са свайго агарода.

Але ў краме насупраць нечакана знайшоў вельмі прыгожыя на выгляд агуркі па цане ўсяго 12300 рублёў за кіло, яблыкі прадавалі за 4350 і 5300 рублёў.

Пакуль хадзіў і запісваў цэны, малады хлопец прапанаваў купіць новы планшэт — усяго за 300 тысяч рублёў. Маўляў, новы, сам ім не карыстаўся, бо грошы вельмі тэрмінова спатрэбіліся. Вельмі прывабная цана, але ж…

Перайшоў на вуліцу Камуністычную, дзе кіло памідораў прадавалі ў палатцы за 15 тысяч рублёў, агуркоў — за 14 тысяч…

На Смаленскім рынку ўбачыў памідоры ўсяго па 8 тысяч рублёў за кіло. Жанчына растлумачыла, што яны такія танныя, таму што «пальчыкі». Недалёка памідоры круглай формы прадавалі зноў за 15 тысяч, агуркі ад мясцовага сельскагаспадарчага кааператыва — за 12, моркву — за 7 тысяч рублёў.

У крытым будынку таго ж рынка знаёмая гандлярка прадавала памідоры па 13 тысяч, агуркі — па 10 тысяч, моркву — па 5 і 6 тысяч рублёў, кітайскі часнок — па 28 і 35 тысяч рублёў за кіло. Разгаварыліся. Сказала, што пакуль на вуліцы даволі цёпла, пакупнікоў у яе мала. На гародніну гаспадар яе гандлёвага пункта «накручвае» цану на 10%, на многія плады — на 20%, на ананасы і некаторую іншую экзатычную садавіну — да 30%. Але ўсё залежыць ад цаны пастаўшчыка…

З другога боку крытага будынка многія прадавалі кіло бульбы за 4 тысячы рублёў, некаторыя прасілі на 500 рублёў больш.

Зрабіў вельмі карысную выснову: перад тым, як адправіцца па пакупкі, трэба проста прайсціся і не пасаромецца запісаць, што і колькі каштуе. Калі, вядома, вы лічыце кожны рубель. Гандляры прызналіся, што ў крамах буйных гандлёвых сетак аналагічная карысная для здароўя прадукцыя каштуе… танней. Ды і якасць садавіны і гародніны там гарантаваная, бо ёсць адпаведныя дакументы. А дзе гарантыя, што з рук вы не купіце гародніну, якая расла на вялікай колькасці нітратаў? Таму «бабкі» і «дзедкі», ды і рынкі — не канкурэнты супермаркетам. Тым больш што ў халодны час года там заўсёды цёпла і ўтульна. Іншая справа, што не ўсім пашанцавала жыць па суседстве з такімі буйнымі гандлёвымі аб'ектамі. Таму і ходзяць людзі па «вітаміны» на вуліцу і міні-рынкі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

■ Настаўнікі і вучні

# КАМУ СКАРАЕЦЦА ТРЭЦІ ЎЗРОСТ,

## або Як стаць выкладчыкам у 12 альбо ў 67?

**Рабіць добрыя справы ніколі не рана і не позна. Штодня гэтую вядомую ісціну сцвярджаюць валанцёры Інстытута трэцяга ўзросту. Дапамагчы і падзяліцца ўласным досведам тут гатовы любы добраахвотнік, незалежна ад колькасці гадоў у пашпарце.**

### УДАЛЫ ВАЛАНЦЁРСКІ СТАРТ

Яраслава Пасталенка вучыцца ў сёмым класе каледжа-гімназіі імя Івана Ахрэмчыка. У будучыні яна плануе стаць архітэктарам, пабудаваць вялікі прасторны дом і даць прытулак тым катам і сабакам, якія несправядліва апынуліся на вуліцы. Думаеце, гэта дзіцячая мара-ўтопія? Не згаджуся: у свае 12 гадоў Яраслава пацвярджае, што для добрай справы няма ніякіх перашкод. Сёлета яна зноў будзе выкладаць на камп'ютарных курсах для тых, каму за 60. А пачыналася яе валанцёрства з прыкладу мамы, якая вырашыла прыносіць карысць не толькі роднаму прадпрыемству ў якасці вядучага эканаміста, але і навучэнцам інстытута.

Увогуле, тутэйшыя заняткі разбураюць шаблон таго, як выглядае стандартнае навучанне. Замест сталага выкладчыка — дзяўчынка-гарэза Яраслава, на месцах непаслухмяных вучняў — дзесяць дарослых жанчын і мужчын.

— Стаць валанцёрам мне прапанавала мама. Раз на тыдзень, у пятніцу, я вучыла бабуль і дзядуляў. Узровень іх падрыхтоўкі быў розны. Хтосьці пачынаў з нуля, нехта ўжо меў уяўленне, як карыстацца камп'ютарам. Напачатку мы знаёміліся з элементарным: што такое клавіятура, прынтар, мышка.

Дарэчы, апошняя выклікала асаблівы страх у навучэнцаў Яраславы.

— Мае вучні чамусьці баяліся нават лішні раз дакрануцца да яе. Націснуць два разы запар, каб адкрыць файл, першапачаткова стала самай вялікай цяжкасцю. Я спецыяльна давала хатнія заданні, каб яны патрэніраваліся стварыць дакумент, напісаць ліст. Мае вучні паслухмяна выконвалі кожнае заданне. Калі не разумелі штосьці, клікалі да сябе, і тады я шукала патрэбныя словы, каб растлумачыць і расказаць максімальна зразумела.

Сталыя студэнты знаходзілі агульную мову са сваёй юнай выкладчыцай вельмі хутка. Дзяўчынка сапраўды палюбілася ім. Яраслава расказвае, што, напрыклад, навучэнцы яе мамы часта саромеліся задаваць пытанні сваёй настаўніцы. Клас Яраславы гэтая праблема абмінула.



— Атмасфера ў нас была абсалютна вольная, ніхто мяне не саромеўся. Узнікла пытанне — тут жа яго агучылі і вырашылі.

Яраслава прызнаецца, што ёй па душы справа, якую яна робіць для пажылых людзей.

— Гэта цікава — адчуваць сябе выкладчыцай, калі сама яшчэ школьніца. Многія бабулі ставіліся да мяне як да ўнучкі. Напачатку нават цукеркі прыносілі. Мне было няёмка іх браць, але адмовіцца — таксама.

У наступным семестры, які пачынаецца ўжо ў кастрычніку, Яраслава зноў сустрэне новую групу навучэнцаў. У валанцёрстве яна хутка стане старажылам. Аднак дзяўчынка ўпэўнена, што гэта толькі пачатак, і з ахвотай паспрабуе сябе ў іншай валанцёрскай якасці.

### «…ГЭТЫ ЧАС МЫ ПРАЖЫЛІ НЕЗДАРМА»

Пакуль гады не дасягнулі пенсійнай мяжы, Аляксандр Андрэевіч Захаранка працаваў і вядучым інжынерам, і начальнікам участка. Заслужаны адпачынак ён вырашыў праводзіць з карысцю не толькі для сябе, але і для сваіх «калег па ўзросце». Скончыўшы камп'ютарныя курсы пры Фрунзенскім тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, ён адкрыў новую старонку сваёй працоўнай біяграфіі — выкладчыцкую, з пазнакай «валанцёр».

— У прынцыпе, усё жыццё мне даводзілася вучыць інжынераў. Лічу, што валодаць ведамі і трымаць іх пры сабе вельмі непрыгожа, — распавядае Аляксандр Андрэевіч. — Калі ў мяне ёсць вольны час і пэўныя веды, а людзі маюць патрэбу ў іх, чаму не дапамагчы?!

Так у 67 гадоў Аляксандр Андрэевіч стаў валанцёрам Інстытута трэцяга ўзросту. Ці цяжка было пераўвасобіцца ў выкладчыка?

— Абсалютна не, — з упэўненасцю адказвае суразмоўца. — Я заўжды ўмеў працаваць з людзьмі, знаходзіць да кожнага свой падыход. Гэты досвед і дапамагае мне выкладаць зараз. Вядома, хтосьці больш дысцыплінаваны, нехта — разгільдзяй, аднак наогул атрымліваецца.

Летась плёнам Аляксандра Андрэевіча сталі чатыры камп'ютарна адукаваныя групы. Дзякуючы яму 24 пенсіянеры цяпер могуць выклікаць урача на дом анлайн, заказаць тавары па інтэрнэце, купіць анлайн-квіткі ў тэатр альбо на цягнік, даслаць паведамленне ў сацыяльных сетках, апрацаваць фотаздымкі і шмат што іншае.

— Вучымся мы па спецыяльна распрацаванай кніжцы, дзе апісана ўсё — ад уключэння камп'ютара да арыентавання ў сецівe. Аднак я не абмяжоўваюся толькі ёй, пастаянна шукаю новую інфармацыю ў інтэрнэце, каб быць на некалькі крокаў наперадзе.

Увогуле, Аляксандр Андрэевіч слушна заўважае, што навучыць працаваць на камп'ютары немагчыма. Але можна навучыцца метадам спроб і памылак. Галоўнае — зарыентаваць чалавека, надаць яму імпульс. Камп'ютарныя курсы для пенсіянераў — толькі стартавы пункт, і да яго трэба дадаць час і жаданне. Напрыклад, свой першапачатковы інтарэс выкладчык Захаранка пераўвасобіў у сімпатыю да тэхнічна-рамонтнага складніку камп'ютараў.

— Цяпер я галоўны сямейны спецыяліст у гэтай справе. Рамантую, стаўлю новае праграмнае забеспячэнне. Часта знаёмыя звяртаюцца па параду, які камп'ютар набыць. І тады я ўжо тлумачу, што ў гэтай мадэлі добра, а што не. Мне сапраўды цікава ва ўсім разбірацца самому!

Акрамя няспыннага самаразвіцця, валанцёрства дапамагло набыць нашаму герою шмат знаёмстваў і кантактаў, якія, бясспрэчна, робяць больш разнастайным яго сённяшняе жыццё.

**Заняткі разбураюць шаблон стандартнага навучання: замест сталага выкладчыка — дзяўчынка-гарэза, на месцах непаслухмяных вучняў — дзесяць дарослых жанчын і мужчын.**

— Зносіны заўжды даюць эмоцыі, розныя цікавінкі, узбагачаюць досведам. І неабавязкова ў камп'ютарным аспекце. На перапынку хтосьці абмяркоўвае новы рэцэпт аладак ці зімовых нарыхтовак.

І напрыканцы Аляксандр Андрэевіч дадае:

— Калі чалавек атрымаў карысць, я адчуваю задавальненне. Я бачу плён сваёй новай працы і разумею, што гэтую гадзіну мы пражылі нездарма.

• • •

Яраслава і Аляксандр Андрэевіч — два ўнікальныя прыклады неабыякавасці, з якой яны ставяцца да паважанага трэцяга ўзросту. Такіх у Інстытуце — больш за сотню. Летась з дапамогай валанцёраў 1200 чалавек атрымалі адукацыю, якая ім патрэбна не для працадаўцы ці «скарынкі», а для душы. Некаторыя студэнты пачынаюць жыць абсалютна па-новаму. Як, напрыклад, 76-гадовая выпускніца інстытута. Скончыўшы курсы па журналістыцы, яна паступіла на трэці курс юрыдычнага факультэта і пачала друкаваць свае артыкулы ў расійскіх часопісах. Але пра гэта — ужо іншым разам.

**Любоў КАСПЯРОВІЧ**

■

■ «Прамая лінія»

# НЕ ЧАКАЦЬ, А ЗАРАБЛЯЦЬ ПЕНСІЮ

## Каб нешта атрымаць у старасці, трэба добра папацець у маладосці

**Мы працягваем друкаваць адказы спецыялістаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на пытанні нашых чытачоў. На гэты раз гаворка пойдзе пра тое, як не застацца без пенсіі і чым небяспечныя «шэрыя» бальнічныя. Першы намеснік начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення ФСАН Уладзімір ЖАМЧУЖНІКАЎ і начальнік аддзела сацыяльнага страхавання Аксана ШУШКЕТ раяць задумацца аб сваёй будучыні ўжо сёння.**





Фотаздымкі Любові БЯЛЯЕВАЙ.

### Бальнічныя — з сярэдняга заробку

***Андрэй Болтуць, г. Мінск:*** *Уладкаваўся на працу 4 месяцы таму. Але ў кожным месяцы вымушаны быў браць адзін-два дні за свой кошт. Так атрымалася, што ніводнага поўнага месяца я не адпрацаваў. 14 жніўня я захварэў, а бухгалтар налічыла зусім мізэрныя бальнічныя. Хацелася б ведаць, наколькі гэта правільна.*

**Аксана Шушкет:** Калі вам налічылі бальнічныя, зыходзячы толькі з тарыфнай стаўкі, то бухгалтар не мае рацыі. З 25 ліпеня 2014 года змяніўся парадак аплаты такіх лісткоў непрацаздольнасці. Вам неабходна было адпрацаваць у разліковым перыядзе (6 месяцаў перад хваробай) не менш за 30 дзён. Гэтая норма ў вас выконваецца. Таму вам павінны былі выплаціць бальнічныя не з тарыфнай стаўкі, а з сярэдняга заробку. Раю вам звярнуцца па ўдакладненні ў бухгалтэрыю.

### Іпэшнік атрымае толькі палову дапамогі

***Дар'я Усовіч, г. Мінск:*** *Я з'яўляюся індывідуальным прадпрымальнікам і даглядаю дзіця да трох гадоў. Атрымліваю толькі 50% дапамогі. Калі я не буду працаваць, ці маю я права на атрыманне 100% выплат?*

**А. Ш.:** Вы як індывідуальны прадпрымальнік будзеце атрымліваць 50% дапамогі незалежна ад таго, працуеце ці не. Але ў адпаведнасці з заканадаўствам вы можаце прыпыніць сваю дзейнасць у сувязі з доглядам дзіцяці. Для гэтага вам трэба звярнуцца ў падатковую па месцы пастаноўкі на ўлік і напісаць заяву. З даты, якая пазначана ў заяве, вы маеце права на атрыманне поўнай дапамогі, але яе памер будзе зменены з 1 чысла месяца, які ідзе пасля месяца спынення дзейнасці.

***Кар. «Звязды»:*** *А калі гэтая жанчына яшчэ недзе працавала?*

**Уладзімір Жамчужнікаў:** Тады яна будзе атрымліваць дапамогу па месцы працы. Аднак прыпыніць прадпрымальніцкую дзейнасць усё роўна прыйдзецца, інакш і там будуць выплачваць толькі 50% дапамогі. Між іншым, толькі палову грошай будзе атрымліваць і жанчына, якая пры доглядзе дзіцяці выходзіць на працу больш чым на палову стаўкі.

### Водгукі ліхіх 90-х

***Кар. «Звязды»:*** *А з іншымі сацыяльнымі гарантыямі ў прадпрымальнікаў таксама бываюць праблемы?*

**У. Ж.:** Напрыклад, бальнічныя мы ім налічваем. Раней гэта было так: плацілі не жывымі грашыма, а рабілі ўзаемазалік з будучых узносаў. Цяпер, калі яны жадаюць атрымаць фінансаванне, то прыносяць лісткі па месцы рэгістрацыі. Галоўная ўмова — аплата ўзносаў (не менш за 35% ад мінімальнай зарплаты штомесяц). Аднак вялікага значэння для прадпрымальніка бальнічныя мець не будуць, бо яны мізэрныя.

***Кар. «Звязды»:*** *З бальнічнымі зразумела — «іпэшнікам» хварэць нявыгадна. Мне здаецца, што яны нават пра пенсію моцна не думаюць. Насамрэч многія прадпрымальнікі зарабляюць даволі значныя грошы, але са свайго прыбытку адлічаюць у Фонд сацыяльнай абароны мінімальныя сумы. Потым гэта паўплывае на памер пенсіі такіх хітруноў?*

**У. Ж.:** Вядома. І не толькі іх. Людзі, якія выходзілі на пенсію гадоў 20 таму і мелі 40 гадоў працоўнага стажу, цяпер атрымліваюць пенсію болей за 3 мільёны. А тыя, хто выходзіць на пенсію сёння і нават мае такі ж самы стаж, атрымліваюць значна меншыя грошы. Для іх такім чынам адгукаюцца праблемы ліхіх 90-х, калі адлічэнні на старасць рабілі ў мінімальных памерах. І нават аб гэтым цяжка бывае знайсці дакладныя звесткі. Тыя людзі, якія казалі «мы да гэтай пенсіі не дажывём», сёння сутыкнуліся з жорсткай рэальнасцю. Гэта тая сітуацыя, калі людзі свядома выбралі сабе такі лёс. Тады пагаджаліся і сёння таксама не супраць атрымліваць «шэрыя» заробкі і не думаць пра старасць. «Дайце мне грошы сёння, а заўтра мяне не цікавіць», — гэты лозунг актуальны для пэўнай часткі насельніцтва і сёння. На жаль.




Фота Надзеі БУЖАН.

Для ўпэўненай будучыні ўжо цяпер трэба мець гонар і годнасць, каб адмовіцца ад сумніўнай прапановы. Тады і кіраўнікам камерцыйных структур прыйдзецца паводзіць сябе па-іншаму: выплочваць «празрысты» заробак, ад якога будуць выконвацца рэальныя адлічэнні ў Фонд сацабароны. Не трэба баяцца абараняць сваю будучыню. Не палянуйцеся і схадзіце ў сваю бухгалтэрыю, удакладніце памеры адлічэнняў, яшчэ раз уважліва перачытайце свой кантракт і гэтак далей.

### Ніводная капейка не згубіцца

***Кар. «Звязды»:*** *Развіццё «новай свядомасці» работнікаў, напэўна, паскарае і ўвядзенне карткі персаніфікаванага ўліку?*

**У. Ж.:** Сам факт існавання гэтай сістэмы ўжо змяніў стаўленне людзей да сацыяльных гарантый. Мы мяркуем, што праз некалькі гадоў (пры ўмове палітычнай волі і эканамічнай мэтазгоднасці) разлік пенсій будзе адбывацца аўтаматычна толькі па звестках персанальнага ўліку. Ад чалавека ўвогуле нічога не будзе патрэбна. Існуе сістэма ўжо 11 гадоў. Мне здаецца, што 20 гадоў яе існавання хопіць для пераходу на новы разлік пенсій. І калі людзі будуць ведаць, што пенсія будзе вылічвацца з сярэдніх паступленняў ад іх у фонд, што толькі афіцыйныя звесткі будуць мець вагу, то гэта будзе прымушаць людзей цікавіцца ў бухгалтэрыі, колькі на іх адпраўлена адпаведных адлічэнняў. Даходзіць да абсурду, калі ў людзей не залічаны цэлыя перыяды працоўнага стажу, бо з прадпрыемстваў не пералічваліся страхавыя ўзносы. Мне здаецца, што прафсаюзныя лідары павінны сачыць, каб ва ўсіх калектыўных дагаворах быў асобным радком прапісаны алгарытм падобных адлічэнняў, а самі работнікі ведалі гэту лічбу.

***Кар. «Звязды»:*** *Ці бывалі выпадкі, каб у чалавека не было пацверджана ніводнага дня стажу?*

**У. Ж.:** Сёння, каб атрымліваць працоўную пенсію, трэба афіцыйна (з абавязковай уплатай узносаў) адпрацаваць 10 гадоў. Яшчэ нядаўна хапала пяці працоўных гадоў. Надалей гэты тэрмін будзе толькі павялічвацца да 15, 20 гадоў мінімальнага працоўнага стажу, бо падобны механізм ужо працуе ў многіх цывілізаваных краінах. Зразумела, ёсць такія сітуацыі, калі ў асобных катэгорый людзей нават такога стажу не будзе. Напрыклад, шматдзетная маці. У гэтым выпадку тэрмін догляду дзяцей ёй залічваецца ў «стаж» і права на пенсію ў яе ёсць. Толькі памер пенсіі будзе не самым вялікім (аднак не меншым за мінімальны памер пенсіі па ўзросце).

***Кар. «Звязды»:*** *На асобных прадпрыемствах у работнікаў з экстрэмальнымі ўмовамі працы адміністрацыя прадугледжвае дадатковыя страхавыя выплаты. На што гэтыя грошы выдаткоўваюцца?*

**У. Ж.:** Калі чалавек датэрмінова выходзіць на пенсію, для Фонду сацабароны гэта дадатковая нагрузка. Таму мы падыходзім да гэтай сітуацыі такім жа чынам, як і ў іншых краінах. Для таго, каб змяншалася колькасць падобных працоўных месцаў, менавіта прадпрыемствы выплачваюць дадатковыя грошы для аднаразовых выплат ці накапляльных пенсій работнікаў. Сёння памеры такіх дадатковых выплат істотна павялічаны. Гэтыя сродкі збіраюцца асобна і змяшчаюцца ў банк для капіталізацыі.

### Мужчынскі бальнічны па цяжарнасці і родах

***Зінаіда Прымак, г. Мінск:*** *Я бухгалтар у дзяржаўнай арганізацыі. Адзін работнік прынёс мне лісток непрацаздольнасці, які выклікае ў мяне сумненні ў сапраўднасці. Што мне трэба рабіць?*

**А. Ш.:** Па-першае, вы самі можаце зрабіць запыт у паліклініку, штамп якой стаіць на лістку. Па-другое, можна звярнуцца ў тэрытарыяльнае аддзяленне Фонду сацабароны з пісьмовай заявай. Калі лісток падроблены, мы гэта бачым адразу. Як правіла, на іх і знакі вадзяныя іншыя, і колер трошкі адрозніваецца. Адразу кідаецца ў вочы іншы шрыфт нумара лістка. Складана адрозніць толькі пячаткі, асабліва на першы погляд. Напрыклад, сёлета ўсе фальшывыя лісткі былі пададзены са штампамі адной і той жа паліклінікі.

***Кар. «Звязды»:*** *Дзе ж людзі бяруць гэтыя падробленыя бальнічныя?*

**А. Ш.:** Робіцца ўсё вельмі проста — праз інтэрнэт. Мы і самі правяралі. Калі звоніш па тэлефоне, ніхто не адказвае. Але праз нейкі час перазвоньваюць з расійскага нумара і дамаўляюцца. А між іншым, у нашай краіне за падачу такіх дакументаў прадугледжана нават крымінальная адказнасць. Хаця часцей такім «хворым» даюць па 90 базавых штрафу. Мне здаецца, што бальнічны таго не варты, каб так рызыкаваць, бо амаль усе падобныя выпадкі хутка выяўляюцца і ў чалавека застаецца пляма на ўсё жыццё. Звольняць з працы ў любым выпадку, бо гэта будзе фактычны прагул.

***Кар. «Звязды»:*** *Хто часцей прыносіць фальшывыя бальнічныя?*

**А. Ш.:** Маладыя людзі гадоў 25-ці. Часта працуюць яны ў будаўнічых ці транспартных арганізацыях. Іх нявопытнасць можна заўважыць нават па саміх лістках. Я яшчэ ніводнага разу не бачыла фальшывы лісток, які быў бы запоўнены правільна. Іх жа прадаюць толькі з пячаткамі, а ўсё астатняе трэба дапісваць самому. Да смешнага даходзіць — аднойчы мужчына прынёс у бухгалтэрыю лісток непрацаздольнасці з кодам, які расшыфроўваўся «цяжарнасць і роды».

### Калі даглядалі, за тое і атрымалі

***Алена Гайдук, г. Мінск:*** *Мне выдалі бальнічны па доглядзе хворага шасцігадовага дзіцяці ў суботу. У мяне пяцідзённы рабочы графік. Але аплацілі мне бальнічны толькі з панядзелка. Ці мае рацыю бухгалтар?*

**А. Ш.:** Бухгалтар зрабіў правільна. Згодна з інструкцыяй, лісток непрацаздольнасці па доглядзе хворага члена сям'і выдаецца з дня, калі асоба, якая ажыццяўляе догляд, мае патрэбу ў вызваленні ад працы. Паколькі ў перыяд догляду хворага дзіцяці ў суботу і нядзелю вы не мелі патрэбы ў вызваленні ад працы, то дапамога па часовай непрацаздольнасці вам можа быць налічана толькі з панядзелка.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, Сяргей КУРКАЧ**

■

■ Кантроль

# ПЕРАВОЗІЛІ «ШЭРЫЯ» МЕДПРЭПАРАТЫ

**Падчас рэйду супрацоўнікі падраздзялення БЭЗ Мінскага УУС на паветраным транспарце паблізу Нацыянальнага аэрапорта «Мінск-2» пры праверцы аўтамабіля «Фольксваген Транспарцёр» выявілі і канфіскавалі медыцынскія прэпараты на агульную суму больш за 2,8 мільярда рублёў. Яны належалі таварыству з абмежаванай адказнасцю і перавозіліся без адпаведных дакументаў.**

Пры вывучэнні папер, прад'яўленых камерцыйнай структурай, супрацоўнікі УБЭЗ ГУУС Мінгарвыканкама звярнулі ўвагу на шэраг неадпаведнасцяў у іх. Гэта дало падставы меркаваць, што медыкаменты набываліся па так званых «шэрых» схемах — з мэтай фіктыўнага заніжэння іх кошту і далейшага пазбягання падаткаў. Калі б схема спрацавала, бюджэт дзяржавы недаатрымаў бы значныя грашовыя сродкі. Прадпрыемству пагражае штраф у памеры да 10 базавых велічынь і канфіскацыя тавару ў даход дзяржавы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# БІЗНЕС НА СПІРЦЕ

**У Бабруйску затрымана нелегальная партыя спіртазмяшчальнай вадкасці на 171 мільён рублёў.**

Падзарабіць такім чынам не атрымалася ў 34-гадовага расіяніна, грузавік якога праваахоўнікі затрымалі ў Бабруйску.

— 3420 літраў спіртазмяшчальнай вадкасці расійскай вытворчасці перавозіліся без суправаджальных дакументаў, якія пацвярджалі б легальнасць яе ўвозу. Ёмістасці не былі прамаркіраваны кантрольнымі (ідэнтыфікаванымі) знакамі Рэспублікі Беларусь, — адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення ДФР КДК РБ па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН.** — Нелегальная прадукцыя была дастаўлена з Масквы ў 5-літровых ПЭТ-бутэльках і прызначалася для далейшага перапродажу праз «гандлёвыя пункты» ў прыватным сектары Бабруйска.



Фота аўтара.

Спірт канфіскаваны, а правапарушальнік прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры 100 базавых велічынь (частка 3 артыкула 12.27 КоАП РБ). Праваахоўнікі папярэджваюць іншых шукальнікаў лёгкіх грошай аб тым, што за аналагічнае злачынства існуе яшчэ і крымінальная адказнасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# НА СТА НЕ ЎСЁ БЕЗДАКОРНА

**Незахаванне рэжыму працы, неафармленне пры прыняцці на тэхнічнае абслугоўванне аўтамабіля прыёмна-здатачнага акта, непрад'яўленне дакументаў, што сведчаць якасць і бяспеку запасных частак, якія выкарыстоўваюцца… Гэта тыповыя парушэнні, выяўленыя пры праверцы станцый тэхнічнага абслугоўвання.**

Як паказалі вынікі маніторынгу, праведзенага гандлёвай інспекцыяй Мінгандлю разам з прадстаўнікамі Дзяржстандарту, парушэнні заканадаўства ў сферы бытавога абслугоўвання былі выяўлены практычна на ўсіх станцыях тэхнічнага абслугоўвання, куды наведаліся з праверкамі спецыялісты. Найбольшая колькасць заўваг выказана ў дачыненні да двух аб'ектаў аўтасэрвісу Маскоўскага раёна сталіцы. Сур'ёзныя парушэнні выяўлены на аб'ектах у Віцебску, Гродне, Гомелі. Усім суб'ектам выдадзены рэкамендацыі па выпраўленні недахопаў. Аўтааматары, якія сутыкаюцца з праблемамі на станцыях тэхнічнага абслугоўвання, могуць звяртацца ў Міністэрства гандлю па тэлефоне даверу 200 92 02.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

■ Далучайцеся!

# КУБАК ЗА МОВУ!

## Беларускамоўны спартыўны фестываль пройдзе заўтра ў сталіцы

**У вядомай беларускай плыўчыхі Аляксандры Герасімені лёгка атрымліваецца паляпшаць настрой. І не толькі сваім абаяннем, але і добрымі, прыемнымі ўчынкамі. Вось і зараз Аляксандра зноў прыемна ўразіла многіх. Справа ў тым, што заўтра ў сталіцы адбудзецца спартыўны фестываль «Мова Cup», удзельнікі якога павінны будуць на працягу спаборніцтваў размаўляць па-беларуску. Герасіменя стала адным з ініцыятараў гэтай акцыі.**

— Я хадзіла ў рускамоўны дзіцячы садок, пасля вучылася ў рускамоўных класах, але з нашай мовай у мяне ніколі не ўзнікала пытанняў, — прызнаецца Аляксандра. — Так, у маім жыцці галоўнае месца займаў спорт. Для мяне было важна, што я магу прадстаўляць Беларусь на міжнароднай арэне, імкнулася дасягнуць максімальных вынікаў. А цікавасць да беларускай мовы з'явілася ў мяне некалькі гадоў таму. Многія мае знаёмыя замежныя спартсмены прасілі, каб я ім нешта сказала на роднай мове. Спрабавала, аднак адчувала, што мову разумею добра, але не магу доўга камунікаваць. Менавіта таму я пачала актыўна чытаць беларускамоўныя кнігі, размаўляць. Дарэчы, у гутарках з замежнікамі я заўважыла, што нашу мову разумеюць украінцы, палякі, славенцы. Мовы падобнымі назваць не магу, але нешта агульнае ўсё роўна прысутнічае.

**— А якія кнігі на беларускай мове прачыталі першымі?**

— Спачатку мне далі прачытаць «Жураўліны крык» Васіля Быкава, а пасля падарылі асобную кнігу Быкава. Таксама ў мяне ёсць творы паэта Генадзя Бураўкіна. Дарэчы, менавіта ён і даў пачытаць кнігі Васіля Быкава.

**— У многіх сваіх інтэрв'ю сваім беларускім кумірам вы называеце Кастуся Каліноўскага.**

— Два гады таму я вучылася ў Злучаным Каралеўстве, і ў мяне было заданне напісаць нешта накшталт сачынення пра беларусаў, якіх ведалі ў свеце. Вось я і вырашыла напісаць пра Каліноўскага.

Між іншым, я чула аб тым, што ў многіх краінах маленькія дзеткі маюць сваіх герояў. Яны ведаюць іх і вераць у іх. У нас падобных няма, і ў гэтым кірунку таксама можна зрабіць нешта карыснае.

**— Цікава, а хто першым прапанаваў ідэю «Мова Cup»?**

— Першыя ідэі з'явіліся, напэўна, паўгода таму. Знянацку гэта не адбылося. Мы шмат часу разам з журналістам Сяргеем Шчурко правялі ў разважаннях аб гэтым фестывалі, каб ён зацікавіў усіх, каб людзі ў ім былі патрыётамі. Гэта дабрачынная акцыя. Прыняць удзел можа кожны, хто хоча добра правесці свой вольны час. Мы нікога не прымушаем. Плануем, каб гэтая акцыя стала традыцыйнай.

**— А каго асабіста хочаце ўбачыць сярод удзельнікаў?**




Pressball.by

— Будзе каманда з Міністэрства спорту і турызму — а гэта вельмі добрая навіна. Здаецца, гэта спартыўная структура, але раней яна не ўдзельнічала ў падобных мерапрыемствах.

**— Калі ў інтэрнэце з'явіўся ваш здымак у майцы з элементамі вышыванкі, адразу пайшлі каментарыі: Саша, ты прыгажуня!»**

— А майка мне таксама падабаецца. Таму цалкам магчыма, што, калі паеду за мяжу, буду ў ёй. Дарэчы, мы, спартсмены, заўжды носім адзенне з беларускай сімволікай. Таму для мяне гэта норма.

**— Аляксандра, а чаго вы самі чакаеце ад дэбютнай «Мовы Cup»?**

— Убачыць людзей, якія б ад удзелу атрымалі асалоду. Дзяцей, якія запішуцца ў спартыўныя школы. І, безумоўна, таксама хочацца, каб людзі падчас фестывалю імкнуліся як мага больш размаўляць па-беларуску.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■

**Спаборніцтвы адбудуцца ў спартыўным комплексе РЦАП (вуліца Каліноўскага, 111). У праграме — турнір па міні-футболе, стрытболе, плаванні, лёгкай атлетыцы (эстафета 4 па 400 метраў), бадмінтоне, гіравым спорце. Таксама можна будзе паспрабаваць свае магчымасці ў штурханні ядра, скачках у даўжыню, у кіданні мабільнікаў і ў забегах на 50 метраў з дзяўчатамі на плячах, пасапернічаць у сеансе адначасовай гульні з шахматыстамі нацыянальнай зборнай. Запісацца для ўдзелу можна будзе непасрэдна на месцы. Рэгістрацыя пачнецца ў 10:00.**

■ Адмысловыя сустрэчы

# ВЫПІСАЦЬ «ЗВЯЗДУ» — ЗРАБІЦЬ ПАДАРУНАК

**Праспект газеты «Звязда». Чацвер. Вечарэе. На паштовым аддзяленні імкліва збіраюцца людзі. Адны — каб аплаціць паслугі, другія — атрымаць ці адправіць пасылку, трэція вырашаюць іншыя справы. Але былі сярод іх і тыя, хто спецыяльна прыйшоў сюды, каб падпісацца на «Звязду»...**



Паштальён Таццяна ШЫПІЛАВА.

Ці проста сустрэцца са сваёй любімай газетай. Як Аксана Камінская, якая выпісала «Звязду» на год наперад. А прыйшла, каб асабіста пазнаёміцца з любімай аўтаркай. «А Валянціна Доўнар сёння будзе?» — адразу спытала яна, раптоўна засумаваўшы. «А я тут і кнігі яе прынесла падпісаць...» Запэўніўшы, што такая магчымасць яшчэ будзе, спыталі, як доўга мінчанка сябруе са «Звяздой».

— Дакладна і не скажу. Вас яшчэ на свеце не было! Першы раз выпісала, праўда, выпадкова, але ні разу яшчэ не пашкадавала.

Раней на многіх прадпрыемствах падпіска была абавязковай. Выбраць было з чаго: і газеты, і часопісы. «Звязда» тады з'яўлялася адной з самых танных, крыху больш за 5 рублёў каштавала, — прызнаецца Аксана Уладзіміраўна. — Тры месяцы, на якія выпісала газету, праляцелі незаўважна. Зразумела, што без «Звязды» ўжо не змагу — спадабалася!»

Сёння ў нашай чытачкі ёсць шэраг любімых рубрык, аўтараў, якіх рэгулярна адсочвае. Нават рэклама цікавіць жанчыну! Прычым тая, якая звычайна змяшчаецца ў канцы нумара. «Там часта банкі публікуюць свае справаздачы, а мы, пенсіянеры, нейкую капейку збіраем, вось і прыглядваемся, куды можна яе ўкласці», — тлумачыць жанчына.

Пакуль размаўлялі, у нас з'явілася новая падпісчыца. «Звязду» выпісала ўпершыню. «Люблю нашу родную мову, — прызналася Аляксандра Мянжынская-Войтава. — Мая маці ўдзельнічала ў Вялікай Айчыннай вайне. Ведаю, што ў вашай газеце шмат увагі надаецца ветэранам. Думаю, матулі будзе цікава пачытаць. І як так — жыць на праспекце газеты «Звязда» ды не выпісаць выданне...»



Аляксандра МЯНЖЫНСКАЯ-ВОЙТАВА ўпершыню афармляе падпіску на «Звязду».

Як расказала Ірына Бурачэўская, якая таксама выпісала нашу газету ўпершыню, пра цікавыя публікацыі ў «Звяздзе» ведае ад сваёй супрацоўніцы. Дзяўчына, якая амаль у два разы маладзейшая за яе, з задавальненнем чытае нашу газету, найбольш цікавым дзеліцца на працы. Вось і заінтрыгавала сваю начальніцу. «А ўвогуле, гэта цудоўна, што ёсць яшчэ людзі, якія размаўляюць і пішуць на беларускай мове, — падзялілася жанчына. — Вось і я, выпісаўшы «Звязду», буду адначасова сваё веданне мовы, даведвацца пра сапраўднае беларускае жыццё!»

Што, па сутнасці, ужо даўно робяць у рэгіёнах. Вось і яшчэ адна мінчанка, выпісаўшы «Звязду», вырашыла зрабіць падарунак свайму свёкру, які жыве ва Уздзе. Аформіўшы падпіску на квартал, яна атрымала купон, чым, магчыма, зробіць падарунак і сабе, выйграўшы суперпрыз. Такі шанц ёсць у кожнага нашага падпісчыка. Дасылайце запоўненыя купоны і станавіцеся ўладальнікамі цеплавентылятараў і хлебапечкі!

**Веранiка КАНЮТА.**
**Фота Надзеі БУЖАН**

■


**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**
**на IV квартал або II паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце ДА 9 КАСТРЫЧНІКА 2014 ГОДА ў рэдакцыю на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**

**7 цеплавентылятараў Electrolux**

**Суперпрыз — хлебапечка**

Сярод падпісчыкаў 14.10 2014 года будзе разыграна 7 цеплавентылятараў і суперпрыз — хлебапечка. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.10.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2014 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні «У цёплую зіму са «Звяздою» чытайце ў нумары газеты «Звязда» за 4.09.2014.

**Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.**
**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 6.09.14 ПА 31.12.14.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2422 ад 01.09.14, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

5 **Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2014 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ на IV кв. або 2–е паўг. 2014 года

Хатні адрас і тэлефон [ ] (індэкс) ____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!


СУБОТА, 11.25

# ЗАПОЎЗ ПРУСАК НА ПРЫСАК

**Штотыдзень па суботах у эфіры тэлеканала «Беларусь-3» адбываецца гульня «Размаўляем па-беларуску». Магчыма, і вы, паважаныя чытачы, захочаце стаць яе ўдзельнікамі. Такая магчымасць рэальная: варта толькі сабраць сваю каманду з 4 чалавек, запоўніць заяўку на сайце 3belarus.by ці tvrgomel.by і правільна адказаць на пытанні адборачнага тура. А пакуль мы крыху прыадкрыем заслону над тымі пытаннямі, якія гучаць у праграме. Алена Трацэнка, рэдактар тэлерадыёкампаніі «Гомель», дзе ствараецца праграма, дазволіла выкарыстаць некаторыя заданні разам з адказамі. Зразумела, тыя, на якія ўдзельнікі праграмы ўжо адказвалі.**

**Ці ведалі вы, што:**

- Дэ́сань — гэта ўзор аздаблення якой-небудзь рэчы. «Плачуць дрэвы празрыстай расой, а раса завіваецца ў дэсань», — пісаў беларускі паэт Уладзімір Дубоўка.
- Імша́ра — гэта мохавае балота. Дарэчы, слова «мшара» без прыстаўной літары «і» са значэннем мохавае балота змяшчаюць шмат якія слоўнікі рускай мовы.
- Дзядзі́нец — цэнтральная частка старажытнага горада. Па адной з версій навукоўцаў, тэрмін дзядзінец утварыўся ад слова дзед (месца, дзе ў старажытнасці дзяды-старэйшыны збіраліся на нараду).
- Пры́сак — гэта вельмі гарачы попел. Няправільна казаць «гарачы прысак», гэта парушэнне лексічнай нормы беларускай мовы, бо ў семантыцы слова «прысак» ужо закладзена значэнне «гарачы».
- Амбаса́да — пасольства краіны. Слова «амбасада» — з лексікі часоў Вялікага Княства Літоўскага. Сёння гэтае слова вяртаецца. Як і слова амбасадар — пасол.
- Сцызо́рык — гэта невялікі складаны кішэнны нож. Трапіла да нас з польскай мовы. Але карані яго хаваюцца ў лацінскай мове: scissor — «які наразае».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**P.S.** Далей шукайце цікавінкі віктарыны ў «Звяздзе» па пятніцах.

■ Хто каго?

# «ПРАДКАЗАЎ СІНОПТЫК РАБАЎ КАТАКЛІЗМЫ З БУЙНЫМ ГРАДАМ...»



**Анекдоты, як дзеці: свае — найлепшыя, нават... старыя.**

**На правым беразе ракі, значыць, маладзіцы неяк сабраліся — агаліліся, загараюць... А на левы мужчыны тым часам прыйшлі. «Трэба плыць! — адразу ж загарэўся самы малады, 20-гадовы... «Навошта, — спыніў яго ўдвая старэйшы, — яны зараз самі сюды прыплывуць». «І было б чаго, — не зразумеў іх абодвух дзядок-пенсіянер. — Усё і адгэтуль добра відаць».**

Прыкладна такія ж думкі былі і ў нашых чытачоў, якія, у чарговы раз паглядзеўшы на конкурсны здымак (уверсе), узяліся прыдумваць подпісы. Дык чытайма:

*Ах, якія маладзіцы!..*
*Не збаяўся б я вадзіцы:*
*Кумільгом бы*
*Рукі ў бокі*
*І пайшоў бы з імі ў скокі! —*

абяцае **спадар Іван Астроўскі з Мінска** (трэба разумець, ад імя маладзейшага?).

*Няма бабам перашкодаў —*
*Праз агонь ідуць і воду:*
*На тым беразе ракі*
*Ажно два халасцякі! —*

піша (відаць, за сярэдняга па ўзросце) **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч**.

А вачыма найстарэйшага, як і варта было чакаць, паглядзеў на здымак **спадар Мікалай Старых з Гомеля**:

*Спаў Міхась ды бачыў сон,*
*Што ў кустах схаваўся ён,*
*А на беразе ракі —*
*Гуртам дзеўкі і жанкі.*
*Пачалі ісці ў ваду,*
*Распранацца на хаду...*
*А што потым?*
*Таямніца —*
*Сон «парвала» навальніца.*
Во ліха!

Але гэта — калі разважаць пра высокае, вечнае, пра адносіны мужчыны і жанчыны... Калі ж пра нешта больш празаічнае і зямное, то:

*І нашчадкам скажа фота:*
*«Во была ў той год спякота!*
*Нават Нёман маладзіцы*
*Пераходзілі ў спадніцах!»*

Піша так **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў** і адразу ж прабачаецца: «Хай даруе мне дзядзька Колас, бо Нёман — гэта яго любімая рака, якая і карміла, і паіла, і кожнага з вяскоўцаў, можна сказаць, вынасіла на сваіх плячах. Па ім, па Нёмане, у Коласаў час плыты сплаўлялі. А цяпер? Абмялеў — і ён, і іншыя вялікія рэкі».

Пра малыя, трэба разумець, і казаць не варта... Але ж спадар Валерый кажа: «Некалі праз нашу вёсачку працякала рачулка, якая дзяліла паселішча на дзве паловы. Дык я, жывучы на іншым беразе, не мог падчас разліву ў школу зайсці! Канікулы ад паводкі залежалі. А цяпер... Пабываў нядаўна ў вёсцы. На тым месцы нават балотца няма!».

Так узгадвае сваю рэчачку спадар Валерый Гаўрыш. А вось як — **спадар Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна**:

*За апошнія гады*
*Рэчка стала плыткай:*
*Нават бабы не заўжды*
*Там намочаць лыткі!*
Іншая рэч — мужыкі:
*Будзь там Буг*
*ці нават Прыпяць,*
*Мо Дняпро ці слаўны Сож —*
*Як захочаш чарку выпіць,*
*Паімчыш... І басанож!*

Што праўда, тое праўда, — многія разуваюцца і спрабуюць бегчы. Нават, здараецца, бягуць... Але ж, як правіла, недалёка: да мэты (чытай — да той чаркі) не ўсе дабягаюць...

Жанчыны, зрэшты, таксама. Праўда, іх (паводле **спадарыні Любові Чыгрынавай з вёскі Забалацце Вілейскага раёна**) у рэчку можа іншы клопат загнаць:

*Прадказаў сіноптык Рабаў*
*Катаклізмы*
*з буйным градам.*
*Каб адвесці як бяду,*
*Бабы цугам — у ваду...*

**Спадарыня Соф'я Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна** ведае нават, навошта:

*Перасохла ўсё ў гародах —*
*Што ні дзень, то 25...*
*Дык жанкі з тае нагоды*
*Давай рэчаньку араць!*
*Ажно плуг свой утапілі!..*
*Ды залевы не ўпрасілі.*
*Час цяпер хлапцоў гукаць —*
*Трэба ж плуг той даставаць!*

Гляньце на здымак: своеасабліва «гукаюць», праўда? Маўчком. «Голас» хіба што калені падаюць — разам са **спадарыняй Раісай Васільевай з Гомеля**:

*Цётка Глаша*
*сарамліва*
*Фартушок свой апусціла —*
*Ножанькі схавала*
*ад чужых вачэй...*
*А вось маладзіцы —*
*Падняλі спадніцы*
*Высака-высока...*
*і яшчэ вышэй!*

Чаму? Ёсць тлумачэнне! У **спадара Гарачова**:

*Калі сонца ўжо не грэе,*
*Зацвітае верас,*
*Бабы — быццам звар'яцелі,*
*Бо пайшлі на... нераст.*
Бедныя!

Чаму? Ды з таго ж канверта і, можна сказаць, у працяг:

*Паміж тоняў і балот*
*Дзеўкі водзяць карагод.*
*Без каханкаў, без мужоў,*
*Бо на іх... сезон прайшоў.*

Во якая жуда! І гэта пры тым, што адна з кабет у свой час прызнала:

Дзеці — наша радасць,
А мужчыны — слабасць.
Як дасі ім слабіну, —
Усю жытку гнеш спіну.

Што, пагадзіцеся, чыстая праўда, бо на дачок сваіх маці батрачка, пакуль рук не сашчэпіць. Гэта — агульнавядомая прыказка.

**Спадарыня Кусянкова**, гледзячы на здымак, узгадвае свае, мясцовыя мудраслоўі:

*«Што ў багатага ў клеці,*
*Тое ў язя ў галаве» —*
*Мудрасць гэтая дагэтуль*
*У ваколіцах жыве.*
*Як жыве яшчэ й такая,*
*Што баяцца прымушае:*
*Не злавіць бы дзеўцы язя,*
*Пад падол каторы лазе...*

А вось п'явак лавіць — можна. Гэта нават карысна, як лічыць **спадар Гарачоў**:

*Там сабакі не брахалі!*
*Нават кот не мяўкаў, —*
*Бабы босымі нагамі*
*Вабілі піяўкаў.*
*Гэта — моды новы піск:*
*Так цяпер... зніжаюць ціск!*

І каб толькі, а то ж бяры болей, як той казаў! «У нашых вёсках, — узгадвае (спачатку прозай) **спадар Мікола Кісель з Мінска**, — некалі даўней былі прасторныя хаты ці клубы, а то «веранды» ці танцпляцоўкі, куды людзі, незалежна ад узросту, прыходзілі адпачываць. Маладыя адрываліся ў гулях і танцах, пажылыя маглі пасядзець, пагаманіць, паслухаць музыкаў, а то і кінуцца ў скокі — успомніць сваю маладосць. Цяпер, на жаль, такога няма. Цяпер:

*Бабы йшлі на дыскатэку,*
*Ім з парога:*
*«Перш — у рэку.*
*Калі змыеце гады,*
*Можа, пусцім вас сюды».*

Вось як — ні болей ні меней! Толькі маладых на дыскатэкі прапускаюць. А старэйшым кабетам што — чароўныя вадаёмы шукаць? А калі не знойдуць?

Як ні крыўдна з гэтым згаджацца, мае рацыю **спадарыня Гудачкова**:

*Пастаяць яны ў рэчцы —*
*Мелкая вадзіца.*
*Доля бабская такая:*
*Не падмаладзіцца.*

Значыць, трэба так жыць. Пажадана — з песнямі (як лічыць **спадарыня Чыргынава**). А яшчэ... змагацца:

*Атрымаўшы строі новыя,*
*Ішлі харошачкі вясковыя*
*У ваду...*
*Каб замачыць...*
*І насіць іх — не знасіць!*
*Ды спыніла дзевак Марфа:*
*«Стойце,*
*раптам злезе фарба?!*
*Нам жа спонсар не даруе,*
*Грошай больш не ахвяруе».*

І гэта — на нейкія там сукенкі-фартушкі... Што ўжо казаць пра іншае, больш істотнае:

*Вось ужо каторы год*
*Ходзяць людцы цераз брод.*
*Ходзяць, бедныя, наўпрост,*
*Бо стары зламаўся мост.*
*А прыгожы, моцны, новы*
*На паперы намалёван.*
*У каго б жанкам спытаць,*
*Калі будуць будаваць?*

Пытанне рубам, што называецца (ад **спадарыні Чыгрынавай**). Хоць адказ, здавалася б, відавочны: ну, вядома ж, у некага з начальства (пажадана мясцовага). Аднак (на думку **спадарыні Ірыны Ермаковіч з вёскі Азяраўцы, што на Браслаўшчыне**) можна падключыць і карэспандэнта «Звязды». Што жанкі і робяць... Кажуць вось цяпер:

*— Свята вёскі ў суседзяў...*
*Дык здымай,*
*калі ўжо зглядзеў:*
*Цераз рэчку так і пром мы,*
*Бо ні моста, ні парома,*
*Ты б, браток, знайшоў управу,*
*Каб зрабілі пераправу!*

Яна, што відавочна, ну вельмі патрэбна! Аднак, на думку **спадара Гарачова**, даймае гэта не ўсіх:

*Як прайсці цераз раку?*
*Кожны год пантоны рве!..*
*Анатолю ж Клешчуку*
*Толькі дзеўкі ў галаве!*

І сапраўды: ён іх часта здымае — хлеб такі. Вось і тут (на думку **спадарыні Гудачковай**):

*Дзе што дзеецца ў свеце —*
*Усё пабачыш у «Звяздзе»!*
*Тут во — дзеўкі ў канцэрце,*
*А канцэрт той — у... вадзе.*
*Строі, ножкі — усё прыгожа...*
*А спяваць — слухач падможа!*

Ён такі — пакуль што. Слоў, праўда, можа не памятаць, але ж прыпеў падцягне яшчэ.

І тады над вадой, над зямлёй паплыве наша — незабыўнае, пяшчотнае: «Ой рэчанька, рэчанька...», «А ў полі вярба...», «Купалінка...», «А я лягу-прылягу...»

Вам хацелася б на такі канцэрт? Нам — таксама. Але гэта ўжо іншая гісторыя.

Каб завяршыць гэту, нагадаем, што, на думку чытачоў, найлепшыя подпісы да папярэдняга здымка (на ім, калі памятаеце, тры мужыкі не то скручвалі, не то раскручвалі дывановую дарожку на вялікай «брукаванай» плошчы), напісалі **сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадар Гарачоў з Іўеўшчыны, спадарыня Чыгрынава з Вілейшчыны, спадарыні Кусянкова з Рагачоўшчыны і Гудачкова з Жыткавіч**...

Вось з гэтым, апошнім, меркаваннем пагадзілася і журы маленькае — рэдакцыйнае. А значыць, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» (на першы квартал 2015 года) накіроўваецца ў Жыткавічы.

Хочаце, каб у чацвёртым квартале гэтага адзіная штодзённая беларускамоўная прыходзіла і да вас? Тады выпісвайце (сёння — яшчэ не позна) альбо ўважліва паглядзіце на ніжні здымак і прыдумайце подпіс. Згодна з умовамі конкурсу, ён павінен быць трапным, дасціпным і кароткім (не больш за 8 радкоў). Поспехаў!




**Валянціна ДОЎНАР,**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**

■

# ВЫЗНАЧЫЛІ ЛЕПШЫХ АХОЎНІКАЎ

**Учора завяршыўся XI рэспубліканскі агляд-конкурс прафесійнага майстэрства сярод супрацоўнікаў Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, які на працягу тыдня праходзіў у Брэсце. Удзельнікі агляду-конкурсу, судзейская калегія, жыхары горада, шматлікія госці і журналісты пяць дзён жылі ў адмысловым рытме спаборніцтваў. Разам перажывалі, «перадольвалі» перашкоды, атрымлівалі асалоду ад захапляльных момантаў спаборніцтваў, спачувалі няўдачам.**

Што і казаць, выразныя і зладжаныя практычныя дзеянні экіпажаў аховы, веды спецыяльнай, медыцынскай і страявой падрыхтоўкі, меткасць і дакладнасць пры стральбе з пісталета Макарава, адточанае фігурнае кіраванне аўтамабілем міліцыянерамі-кіроўцамі, камбінаваная эстафета і, вядома ж, кінолагі з незвычайнай дрэсіроўкай чатырохногіх памочнікаў нікога не маглі пакінуць абыякавымі.

Удзельнікі спаборніцтваў даказалі яшчэ раз усім прысутным, што Дэпартамент аховы па-ранейшаму адно з наймацнейшых структурных падраздзяленняў органаў унутраных спраў. Гэта не толькі вялізная армія прафесіяналаў, якая забяспечвае грамадскую, асабістую і маёмасную бяспеку грамадзян, але і згуртаваны шматтысячны калектыў са сваімі традыцыямі, з выдатнай адказнасцю і ўзаемадапамогай.

Выклаўшыся за дні спаборніцтваў, што называецца, на ўсе сто, ужо ў бліжэйшыя дні ўдзельнікі агляду-конкурсу заступяць на службу. Для іх мінулы конкурс — своеасаблівы паказчык прафесіяналізму, экзамен, які яны з гонарам вытрымалі.

**Анжаліка ВЫДЖАК-ТАРГОНЯ.**

# СВЯТЛО Ў ЦЕМРЫ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Упершыню пытанне аб неабходнасці зрабіць пешаходаў (у прыватнасці, дзяцей) больш заўважнымі ў цёмны час сутак узднялі яшчэ ў 2002 годзе,— узгадвае Ганна Эдвардаўна.— А праз тры гады была падрыхтавана новая рэдакцыя правіл дарожнага руху. Сярод іншых захадаў была прадугледжана арганізацыя масавай вытворчасці святлоадбівальных элементаў, неабходных для абазначэння пешаходаў. Бум распаўсюджвання «флікераў» распачаўся ў 2006 годзе, а цяпер іх можна купіць у любым кіёску «Белсаюздрук», амаль у кожнай краме. Між іншым, 99 працэнтаў навучэнцаў ужо забяспечаны флікерамі. У асенне-зімні перыяд у навучальных установах педагогі праводзяць праверкі наяўнасці ў школьнікаў святлоадбівальных элементаў. Карысць іх відавочная. Вядома шмат прыкладаў, калі падобныя элементы дапамагалі чалавеку захаваць жыццё. Дарэчы, святлоадбівальныя элементы актыўна прапагандуюць не толькі ў Беларусі. Цяпер іх мусяць выкарыстоўваць і ў Польшчы. А вось у Расіі з імі бяда. На іх рэкламу выдаткоўваюць шмат сродкаў, аднак народ усё роўна іх не прымае.

**— Знаёмы таксіст распавядаў мне аб тым, што ў вячэрні час на дарозе лепш відаць людзей са святлоадбівальнымі ўстаўкамі на адзенні, а не з маленькім «флікерам». Маўляў, такіх трэба начапіць на сябе штук 6, каб цябе кіроўца здолеў убачыць здалёк.**

— Аўтамабіліст пешахода, які ідзе з флікерам, можа ўбачыць на адлегласці 400 метраў. Але варта адзначыць, што яшчэ не ўсе ўмеюць іх правільна насіць. У кожным пакеціку з падвескай ёсць матузок. Для чаго ён? Пры руху пешахода флікер гайдаецца на заплечніку або сумцы, нібы маятнік. І гэта добра, бо ў такім разе яго можна будзе ўбачыць з усіх бакоў. Многія не разумеюць, пытаюцца: «Як я буду яго чапляць на адзенне, калі ён мне не пасуе?». Нічога страшнага. Іх можна насіць на ўзроўні сцягна, прывязваць на кішэнныя замочкі, а пасля проста хаваць у кішэнях. Так званыя святлоадбівальныя павязкі, пра якія казаў ваш знаёмы, пераважна выкарыстоўваюць рабочыя ў сельскай мясцовасці. Ім штодзённа прыходзіцца ісці ўздоўж дарогі на працу, і павязкі на рукавах даюць вялікую гарантыю, што цябе на дарозе заўважаць. Дзеткі звычайна толькі перасякаюць дарогу ў абазначаных месцах, а таму і носяць маленькія флікеры. Дарэчы, на заплечнікі іх лепш вешаць на лямку і на замок. І варта, каб у такім выпадку падвесак у дзіцяці было некалькі.

Паводле Дзяржаўнага стандарту Беларусі, яны павінны быць лімонныя ці белыя. Астатнія выклікаюць сумненні і іх лепш не набываць. Сёння ўжо робяць рознакаляровыя падкладкі, аднак яны ў любым выпадку павінны адпавядаць дзяржаўнаму стандарту. Падвеска абавязкова павінна быць двухбаковай. Лепш за ўсё, безумоўна, набываць іх у крамах. Там вы наўрад ці натрапіце на падробку. Ну і сачыце за тым, каб прысутнічаў суправаджальны надпіс аб тым, што гэта прадукцыя з'яўляецца святлоадбівальным элементам ці падвескай.

**— Дарэчы, у якіх выпадках вы можаце прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці пешаходаў без святлоадбівальнага элемента?**

— Тады, калі вы знаходзіцеся на праезнай частцы (акрамя пешаходнага перахода) у цёмны час сутак. Штраф складзе ад 1 да 3 базавых велічынь. Калі вы пры гэтым знаходзіцеся ў нецвярозым стане, ён павялічваецца да 5 базавых. А калі вамі будзе створана аварыйная сітуацыя, штраф можа дасягнуць і 8 базавых велічынь.

Дарэчы, у кастрычніку мы правядзём маштабную прафілактычную акцыю «Стань заўважным у цемры». Чарговы раз нагадаем людзям правілы дарожнага руху, значэнне флікера для пешахода, веласіпедыста, кіроўцы коннага транспартнага сродку пры дарожным руху. Галоўнае, каб людзі зразумелі, што карыстацца святлоадбівальнымі элементамі трэба не для ДАІ, а для ўласнай бяспекі. Тым больш цяпер — у асенне-зімні перыяд года.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

*Упраўленне Дзяржаўтаінспекцыі паведамляе: 80 працэнтаў дарожна-транспартных здарэнняў адбываюцца ў цёмны час ці пры ўмовах абмежаванай бачнасці. Восенню рэзка скарачаецца працягласць светлага часу сутак. Да таго ж пераход ад дзённага святла да цемры вельмі хуткі. Гэты фактар патрабуе, каб на ўсіх транспартных сродках былі ўключаны габарытныя агеньчыкі, бездакорна працавалі светлавыя прыборы і сігналы.*

# «БАЙЦЫ» ХАТНІХ ФРАНТОЎ

**Спартыўная грамадскасць ЗША шакіравана. Літаральна на днях гулец у амерыканскі футбол Рэй Райс адправіў у накдаўн сваю жонку. Абураныя дзеяннем футбаліста балельшчыкі выстраіліся ў чаргу, каб памяняць майкі з яго прозвішчам, а Белы дом выступіў нават з афіцыйнай заявай. Здавалася б, падобная жудасць адбываецца не з намі, а дзесьці за блакітным акіянам. Аднак, на жаль, і ў Беларусі з гэтым хапае праблем. Як паведамляе Міністэрства ўнутраных спраў, кожны год ад рук сваіх блізкіх у нашай краіне гіне больш за 100 чалавек.**



*Для аказання дапамогі пацярпелым ад сямейнага гвалту штодзённа з 8.00 да 20.00 працуе агульнанацыянальная «гарачая лінія» (8–801–100–8-801). У Мінску любы ахвотны можа звярнуцца ў службу дапамогі грамадзянам, якія пацярпелі ад гвалту, па тэлефоне 8 (017) 280–28–11.*

У сваім жыцці я сустракаў людзей, для якіх паставіць «ліхтар» жонцы пад вокам было нечым звычайным і простым у выкананні. Ды і ўсе падобныя пытанні завяршаліся галівудскім хэпі-эндам: яна яму са слязьмі на вачах даравала кожны ўдар, а ён абяцаў больш не махаць кулакамі. Як правіла, міравая працягвалася нядоўга… Ведаў і пра кухонную панажоўшчыну, але тое, што пачуў ад **Вольгі КАЗАК, псіхолага грамадскага аб'яднання «Радзіслава»,** падчас семінара ва ўпраўленні ўнутраных спраў адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска, збянтэжыць нават самага ўстойлівага чалавека.

— Сямейны гвалт можа завяршыцца не толькі збіццём, але і летальным зыходам. Да нас у шэлтар (прытулак для пацярпелых жанчын) у большасці выпадкаў прыходзяць тыя, хто сутыкнуўся з фізічным гвалтам. Яны расказваюць пра неверагодныя, нават зневажальныя выпадкі. Жонка байца пакінуць без нагляду кубак з гарбатай, бо муж можа туды проста плюнуць. А нехта наогул праколвае алоўкамі, відэльцамі сваіх сямейнікаў, пырскае ў твар асвяжальнікам паветра, б'е ртутныя тэрмометры ў ложку. І многія не ведаюць, што з падобнымі рэчамі можна зрабіць. Калі зламаў руку, скулу, яшчэ могуць выклікаць міліцыю. А калі здараецца падобнае, жанчыны проста ў шоку. Адна з кліентак расказвала, што муж яе душыў, аднак яна не клікала на дапамогу. Але калі ён пачаў яе фатаграфаваць у прыбіральні са спушчанымі штанамі, яна ўжо не вытрымала і патэлефанавала нам. На жаль, многія церпяць і нешта пачынаюць разумець толькі пасля слоў сваіх дзяцей: «Матуля, калі ласка, сыходзь ад таты!».

Між іншым, дзяржава ўжо знайшла частковае выйсце з падобных сітуацый, каб ізаляваць агрэсараў ад сям'і, і зацвердзіла так званае абароннае прадпісанне, дадатковую меру па абароне пацярпелых ад гвалту ў сям'і.

— Яно забараняе грамадзяніну знаходзіцца ў адным памяшканні з пацярпелай, дзецьмі, кантактаваць з імі праз тэлефон і інтэрнэт,— кажа **Дарына БОНДАР, старшы інспектар аддзела прафілактыкі і правапарадку Першамайскага РУУС.**— Ён мусіць выселіцца з кватэры на тэрмін ад 3 да 30 сутак. Пераважная большасць сямейных скандалаў здараюцца не без дапамогі алкагольных напояў. А таму ў гэты прамежак часу мы імкнёмся накіраваць гэтага чалавека ў лячэбна-працоўны прафілакторый. У выпадку парушэння абароннага прадпісання складаецца пратакол.

— Але згадзіцеся, паміж 3 і 30 днямі ізаляцыі існуе розніца.

— Так, і гэты тэрмін вызначае ўчастковы ў залежнасці ад асобы вінаватага. Бо некаторым хапае нават проста паведаміць аб вынясенні прадпісання, як яны адразу прызнаюць сваю віну і паводзяць сябе ўжо інакш.

* * *

У грамадскім пункце аховы правапарадку № 78, што непадалёк ад станцыі метро «Усход», шматлюдна: ідзе пасяджэнне мясцовага савета прафілактыкі. У калідоры не разысціся. Каля кабінета старшага ўчастковага Дзяніса Сысоя вісіць плакат, на якім Юлія Высоцкая пераконвае, што слёзы на кухні мусяць быць толькі ад цыбулі. На жаль, слёзы ў блізкіх трох сённяшніх візіцёраў «апоркі» выклікалі зусім іншыя рэчы. Участковы разам з Валянцінай Дабравольскай, старшынёй савета, па чарзе выклікае ў кабінет мужчын, у якіх за плячыма ўжо ёсць адміністрацыйная адказнасць за гвалт у сям'і. Нехта з іх маўчыць і свідруе вачыма падлогу, чакае, каб хутчэй збегчы ад празмернай увагі, а нехта адкрыта імкнецца палемізаваць.

— Ды я не чапаў сваю маці! Я падзьму — яна паваліцца,— у прысутнасці жыхароў, прадстаўнікоў ЖЭСа, міліцыянераў ледзь не ўзлятае з крэсла ад абурэння беспрацоўны мясцовы жыхар гадоў 50-ці.— Яна выходзіла на вуліцу і неаднаразова падала. Ніхто гэтага не бачыў! Не трэба з мяне здзекавацца!

Але перспектыва патрапіць у ЛПП уціхамірвае бунтара, і ён паступова супакойваецца. У выніку ўсё абмяжоўваецца прафілактычнай размовай і словамі запрошанага на развітанне: «Спадзяюся, мы больш з вамі тут не сустрэнемся».

— Калі нехта б'е сваю маці, гэта проста жах! — кажа пасля пасяджэння стомленая Валянціна Дабравольская.— Узгадайце 5-ую запаведзь: «Шануй бацьку свайго і маці сваю...». Незалежна ад таго, якія яны, бо менавіта маці і бацька далі табе жыццё. Гэта самы вялікі грэх.

Праходзіць яшчэ некалькі хвілін, і мы разам з участковым выходзім з грамадскага пункта аховы правапарадку, каб наведаць некалькі кватэр, якія часам ператвараюцца ў сапраўднае пекла.

— З хатняй агрэсіяй прыходзіцца сустракацца літаральна кожны дзень,— прызнаецца Дзяніс Сысой.— І прыкладна раз на тыдзень нам па выкліку даводзіцца кагосьці наведваць.

Вось і Юрый, рабочы, таксама прыцягваўся да адказнасці за гвалт у сям'і: пасля выпітага пачынаў тэрарызаваць сваіх бацькоў. Як відаць, ад нядаўніх загулаў дома таксама застаўся след — трэшчына на дзвярах у пакой.

У адрозненне ад яго, Вольга, лабарантка аднаго з універсітэтаў, мае трох сыноў, але яны не жывуць з маці. Яе збіраюцца пазбавіць бацькоўскіх правоў. Народжаны некалькі месяцаў таму хлопчык знаходзіцца зараз у Доме дзіцяці.

Пасля хуткай размовы з участковым яна кажа на развітанне, што абавязкова пройдзе лячэнне ад алкагольнай залежнасці і яшчэ верне ў дом, дзе жыве з бацькамі, сваіх сыноў.

— Самае страшнае, калі ты губляеш дзяцей,— на развітанне праз слёзы кажа Вольга.— І я шчыра вам кажу, што вярну іх!

Праўда, паводле заканадаўства, зрабіць ёй гэта цяпер амаль немагчыма.

Перад тым, як напісаць апошні радок у гэтым тэксце, я ўбачыў у інтэрнэце свежую навіну пра яшчэ аднаго амерыканскага спартсмена, які збіў сваю жонку. І, як паказвае практыка, вызначыць і пакараць усіх мужчын з «сіндромам байца хатняга фронту», які не баіцца толькі ў сваёй чатырохсценнай панэльнай каробцы, складана. Але мне, як і ўсім, хочацца верыць, што з дапамогай вышэй пералічаных захадаў цалкам верагодна не толькі папярэдзіць патэнцыяльныя злачынствы, але і зменшыць іх лік наогул.

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.**

■ Супраць наркотыкаў

# І за ўжыванне давядзецца адказаць

**Колькасць канфіскаваных псіхатропаў няўхільна расце. Дзякуючы інтэрнэту і актыўнаму выкарыстанню гаджэтаў, курыльныя сумесі за кароткі тэрмін атрымалі шырокае распаўсюджванне сярод моладзі 15–20 гадоў. Сінтэтычныя наркотыкі адразу выклікаюць наймацнейшую залежнасць, хутка разбураюць арганізм, а пры перадазіроўцы прыводзяць да гібелі. Па гэтай прычыне сёлета загінулі звыш 20 чалавек.**



Фота Надзеі БУЖАН.

— Сёлета выяўлена каля 4,7 тысячы нарказлачынстваў, канфіскавана звыш 120 кг розных псіхаактыўных рэчываў, у тым ліку і такіх, што выкарыстоўваюцца для курыльных сумесяў,— расказвае **выканаўца абавязкаў начальніка ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Васіль ЛОСІЧ.**— У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года выяўлена больш наркалабараторый і памяшканняў па вырошчванні наркакультур, выкрыта больш каналаў паставак. Праваахоўная служба актыўна супрацоўнічае зараз з «Белпоштай», паколькі насенне і наркапрадукцыя спрабуюць пранікаць у краіну з дапамогай у тым ліку паштовай сувязі.

Ёсць і рост колькасці крымінальных спраў, фігурантамі якіх з'яўляюцца непаўналетнія. Наогул цяпер заводзіцца ў 5 разоў больш крымінальных спраў у параўнанні з тым жа перыядам мінулага года. Звязана гэта не толькі з павелічэннем ужывання, але і з большай актыўнасцю праваахоўных органаў, нашай сур'ёзнай работай, якая была праведзена апошнім часам. Летась, напрыклад, у Мінску мы вымушаны былі прыняць сотні рашэнняў аб адмове ў завядзенні крымінальных спраў з-за таго, што канфіскаваныя рэчывы аказваліся не ўнесенымі ў спіс забароненых. Сёлета па ўсёй Беларусі такія толькі чатыры факты. Усе рэчывы, якія ўдаецца канфіскаваць, падпадаюць пад крымінальную адказнасць. Таму мы і паўтараем пастаянна, што ў Беларусі не існуе паняцця «легальныя наркотыкі». Любыя дзеянні з забароненымі псіхатропнымі рэчывамі з'яўляюцца крымінальнымі і караюцца пазбаўленнем волі да 15 гадоў.

Шэраг заканадаўчых ініцыятыў МУС знаходзіцца сёння ў якасці адпаведнага законапраекта ў Палаце прадстаўнікоў і будзе разгледжаны на бліжэйшай асенняй сесіі. Прапануецца, у прыватнасці, зрабіць больш жорсткай крымінальную адказнасць за збыт наркотыкаў непаўналетнім (да 13 гадоў пазбаўлення волі), павысіць адказнасць за выраб наркотыкаў ва ўмовах падпольных лабараторый (да 15 гадоў). МУС таксама выступае з ініцыятывай аб увядзенні адміністрацыйнай адказнасці за немедыцынскае ўжыванне наркотыкаў і псіхатропаў, за знаходжанне ў стане наркатычнага ап'янення на рабочых і ў грамадскіх месцах.

«Мяркую, не кожны студэнт, які бачыць сябе ў будучыні на добрай пасадзе, рызыкне ўжыць наркотык, ведаючы, што за гэта яго прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці, і факт застанецца ў яго біяграфіі назаўсёды,— кажа Васіль Лосіч.— Адміністрацыйная практыка неабходна і для таго, каб прымяняць меры па ізаляцыі і прымусовым лячэнні ў тых жа лячэбна-працоўных прафілакторыях. Такая ізаляцыя прымяняецца пасля парушэння правапарадку ў стане наркатычнага (ці алкагольнага) ап'янення тройчы на працягу года».

Згаданы законапраект прадугледжвае і стварэнне Антынаркатычнай камісіі, узначальваць якую будуць кіраўнікі міністэрстваў унутраных спраў і аховы здароўя, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз. Задачай новага органа стане аператыўнае ўнясенне рэчываў, прызнаных наркотыкам, у спіс забароненых. Механізм работы просты: канфіскаванае рэчыва даследуецца і выносіцца заключэнне аб тым, што гэта наркотык. Інфармацыя публікуецца на сайце МУС, і з гэтага моманту рэчыва лічыцца забароненым. Па сутнасці, такая работа ажыццяўляецца на працягу апошніх двух гадоў у межах дзейнага закона «Аб наркотыках». Ён змяшчае і паняцце аналагаў, якія выяўляюцца і забараняюцца падобным чынам. Цяпер, праўда, прапануецца паралельна з паняццем аналагаў увесці ўніверсальнае — «базавая структурная велічыня».

Чарговая ініцыятыва праваахоўнага ведамства звязана з абмеркаваннем магчымасці распрацоўкі такога нарматыўна-прававога дакумента, які б прадугледжваў абмежаванне доступу карыстальнікаў да адпаведнай інфармацыі ў інтэрнэце. «Без гэтага нам не абысціся,— тлумачыць спадар Лосіч.— А таму мы ўжо падалі пэўныя свае прапановы на разгляд зацікаўленых бакоў».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**Выпадкі гібелі, звязанай з ужываннем наркотыкаў:**
у 2006-м годзе — 90, 2007-м — 45, 2008-м — 72, 2009-м — 58, 2010-м — 69, 2011-м — 75, 2012-м — 134, 2013-м — 83.

**З наркатычнымі атручэннямі ў медустановы дастаўлена:**
у 2013 годзе — 412 чалавек
у 2014-м — 789 (110 з іх — непаўналетнія).

# АПЕРАЦЫЯ ПРЫНЕСЛА ПЛЁН

**За 5 дзён аперацыі «Канал-Даліна» на тэрыторыі Беларусі забралі 171,5 кілаграма наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Выяўлена 84 злачынствы, звязаныя з незаконным абарачэннем наркотыкаў. Да крымінальнай адказнасці прыцягнуты 52 злачынцы.**

Аперацыя адбывалася на тэрыторыі краін — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. У ёй удзельнічалі антынаркатычныя ўстановы, органы бяспекі, фінансавыя разведкі дзяржаў — членаў АДКБ, а таксама краін-назіральнікаў: Афганістана і Кітая. Да маштабных мерапрыемстваў далучыліся і прадстаўнікі падраздзяленняў фінансавых разведак членаў Еўразійскай групы па супрацьдзеянні легалізацыі злачынных даходаў і фінансавання тэрарызму. Штаб аперацыі дзейнічаў у Алматы.

Кожны дзень у аперацыі ў нашай краіне было задзейнічана каля 1,4 тысячы супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў, Дзяржаўнага мытнага камітэта, Камітэта дзяржбяспекі, Дзяржаўнага памежнага камітэта і больш за 240 сумесных аператыўных груп для адпрацоўкі чыгуначнага і паветранага транспарту, аўтадарог, памежнай тэрыторыі.



Ва ўпраўленні па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Рэспублікі Беларусь упэўнены, што аперацыя «Канал-Даліна» — міжнародны інструмент барацьбы з незаконным абарачэннем наркотыкаў. Яе вынікі пацвярджаюць неабходнасць працягу працы па развіцці ўзаемадзеяння на міждзяржаўным узроўні.

**Вольга ЧЭМКО.**

■ Сваімі рукамі

# ГІСТОРЫЯ ГОРАДА НА АГАРОДЖЫ

## ЖЫХАР ЧЭРЫКАВА ВЫРАШЫЎ ТАКІМ ЧЫНАМ РАСКАЗАЦЬ МОЛАДЗІ АБ СЛАВУТЫХ ЗЕМЛЯКАХ

**Агароджа Віктара Рыжыкава сёння нагадвае карцінную галерэю пад адкрытым небам. Маляўнічыя пейзажы мяжуюць з інфармацыйнымі стэндамі, на якіх гісторыя ў тварах. На партрэтах — ураджэнец гэтага краю Герой Савецкага Саюза Філіп Кавалёў, франтавікі, афганцы. Тут жа інфармацыйныя Старонкі аб гераічных ратных подзвігах родных Віктара Рыжыкава і яго землякоў, наступствах Чарнобыльскай аварыі і падзеях вайны ў Афганістане, гісторыя вуліцы Сормаўскай, дзе жыве аўтар і якая да таго, як яе паглынуў Чэрыкаў, была самастойным пасёлкам.**



А яшчэ — напамін пра абяцанне раённых улад, што да 2015 года яны нарэшце заасфальтуюць гэтую самую вуліцу. Цяпер хочаш не хочаш, а абяцанне прыйдзецца выканаць. Тое, што вулічны жывапіс не знікне пасля першага дажджу, гаспадар паклапаціўся загадзя. Акрамя 10 лістоў плоскага шыферу, грунтоўкі і фасаднай фарбы, ён набыў яшчэ і лак. Так што гэта гарантыя на гады.

Заняцца асветніцкай працай падпалкоўніка міліцыі ў адстаўцы падштурхнула жаданне далучыць моладзь да слаўнага мінулага сваёй маленькай радзімы, нагадаць, што ім таксама ёсць чым ганарыцца. Нягледзячы на тое, што Віктар Рыжыкаў усё жыццё працаваў у міліцыі, ён ведае, як карыстацца пэндзлем. Гэтаму яго ў дзяцінстве навучыў мясцовы настаўнік малявання Леанід Чарнышоў. А ідэйным натхняльнікам стала жонка Таццяна Міхайлаўна, якая падзяляе захапленне мужа і духоўна яго падтрымлівае. Тое, што іх асабістая ініцыятыва выклікае такі вялікі грамадскі рэзананс, сужэнцы і не чакалі. Справа рабілася проста ад душы. Дарэчы, на яе аўтар не пашкадаваў амаль 2 мільёны рублёў. І ставіць кропку пакуль не збіраецца. Карцінны рад папоўняць партрэты двух славутых землякоў-генералаў, якія ў розныя часы былі міністрамі МУС Беларусі,— Уладзіміра Ягорава і Юрыя Сівакова.

У райвыканкаме да творчасці Віктара Рыжыкава ставяцца станоўча. Нават шкадуюць, што вуліца Сормаўская знаходзіцца не ў цэнтры Чэрыкава.

— Вельмі прыемна, што ў нашым горадзе жывуць такія людзі,— адзначыла начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Вольга Швінгельская. — Для нас гэта стала сапраўдным сюрпрызам. Чалавек зрабіў усё па асабістай ініцыятыве. І гэта асабліва кранае.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

*У працы над «Фарпостам» нашым карэспандэнтам заўжды добрай парадай, артыкуламі, актуальнай тэмай дапамагае Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў. Між іншым, супрацоўнікі УІГС адзначаюць 30-гадовы юбілей сваёй службы. “Звязда” далучаецца да ўсіх віншаванняў і зычыць нашым сябрам добрага здароўя, творчага настрою і плённай працы!*

**Адказны за выпуск Тарас ШЧЫРЫ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведения аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура | Дата проведения аукциона | Последний день приема заявлений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Бобруйский район, Сычковский сельисполком д. Щатково, пер. 4-й. Масловского, д. 1 | 5 604 955 | 560 496 | 7 627 528 (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1137 га | № 720884012601000203 | Имеется подключение к электроснабжению | 27.10.2014 г. | 21.10.2014 г. до 17.00 |

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Аукцион состоится в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 62, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Бобруйске: 71-74-83, 71-74-30.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);

- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10% от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома № 3600712110013 в АСБ «Беларусбанк» филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;

- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ СЫЧКОВСКОГО СЕЛЬСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА З.С. Трубочка

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ КАПИТАЛЬНЫХ СТРОЕНИЙ, находящихся в собственности ОАО «Фирма «Вейно» 30 октября 2014 года

| № лота | Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь) | Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб. (с учетом НДС – 20%) | Размер задатка, бел. руб. | Характеристика объекта | Условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-91640, общей площадью 2 135,0 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Димитрова, 3Б. Площадь земельного участка – 0,4466 га для содержания и обслуживания хранилища. | 3 947 424 000 | 592 113 600 | Одноэтажное здание хранилища № 5 1954 г. постройки. Фундамент – бутовый, бетонный; стены – кирпичные; перекрытия – железобетонные; перегородки – кирпичные; крыша – толь; полы – цементные, дощатые; проемы оконные – простые, дверные – простые, металлические ворота. Имеется центральное отопление, водопровод, электроосвещение. | Победитель торгов одновременно заключает договор купли-продажи капитального строения и предварительный договор купли-продажи водопроводной сети (протяженностью 73 м) и электрической сети (протяженностью 75 м) по общей стоимости 7 870 840 (Семь миллионов восемьсот семьдесят тысяч восемьсот сорок белорусских рублей (с учетом НДС – 20%). Примечание: Часть капитального строения площадью 1 272,88 кв.м находится в аренде до 15 сентября 2016 г. |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-87329, общей площадью 165,8 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, Вейнянский с/с, 14. Площадь земельного участка – 0,0257 га для содержания и обслуживания бригадного дома | 189 600 000 | 28 440 000 | Одноэтажное здание бригадного дома 1968 г. постройки. Фундамент – кирпичный; стены – кирпичные; перекрытия – деревянные; перегородки – кирпичные; крыша – рулонная; полы – дощатые; проемы оконные – деревянные, дверные – деревянные. Имеется печное отопление. | Без условий |

**Начальная цена снижена на 20%.**
**Аукцион состоится 30 октября 2014 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.**
Заявки принимаются ежедневно с 29 сентября 2014 в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
**Последний день приема заявлений и внесения задатка – «28» октября 2014 года до 17.00**.
Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
Заключительная регистрация участников аукциона – **30 октября 2014 года** с 14.00 до 15.00.

**Продавец: ОАО «Фирма «Вейно», 212003, г. Могилев, Могилевская обл., Могилевский р/н, а/г Вейно, тел.: (0222) 202-336, 8-029-842-77-27.**

**Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны – 22-21-78, 22-00-89.**

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

- **документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на текущий (расчетный) банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» 3012430089016 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, МФО 153001739, УНН 700008710 с отметкой банка;

- **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

**- иностранным юридическим лицом** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- **иностранным индивидуальным предпринимателем** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

**- представителем юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

**- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь** – нотариально удостоверенная доверенность:

**- представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя** – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе с приложением всех необходимых документов, внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, заключившие с организатором аукциона соглашение, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе и получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона. Объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в том же печатном издании, в котором публиковалось извещение. Кроме того, организатор аукциона должен проинформировать участников, подавших заявление на участие в аукционе, об отказе от проведения аукциона.

Перед началом аукциона их участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после их окончания.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – единственный участник аукциона).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона, обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона, в установленном порядке, в соответствии с подписанным в день проведения аукциона соответствующим протоколом, между продавцом предмета аукциона и победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается договор купли-продажи предмета аукциона.

Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником аукциона) в белорусских рублях в установленном порядке.

Условия оплаты – без рассрочки платежа.

С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.

В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 000 000 (Сто миллионов) белорусских рублей: победителем аукциона в случаях неподписания протокола о результатах аукциона, не возмещения организатору аукциона суммы затрат на организацию и проведение аукциона, незаключения договора купли-продажи предмета аукциона; единственным участником аукциона – в случае отказа или уклонения от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, заключения договора купли-продажи предмета аукциона; участниками аукциона, отказавшимися предложить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

**Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: г. Могилев (0222) 22-21-78, 22-00-89.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ТОРГОВОГО ПАВИЛЬОНА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ.
### Лот № 1.

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта** | Торговый павильон |
| **Целевое назначение** | Помещение, не относящееся к жилищному фонду |
| **Местонахождение объекта** | г. Брест, ул. Я. Коласа, 51 |
| **Продавец объекта** | Ликвидационная комиссия ООО «Дисвел плюс» |
| **Организатор торгов** | Ликвидационная комиссия ООО «Дисвел плюс» |
| **Начальная цена продажи, руб.** | 129 438 000 |
| **Шаг аукциона, % – руб.** | 5,0 % – 6 471 900 |
| **Сумма задатка, руб.** | 12 943 800 |
| **Характеристика объекта** | Строительный объем – 91,3 куб.м, общая площадь – 36,1 кв.м. Стены – сэндвич панели, полы – плитка на бетонной стяжке, внутренняя отделка – окрашено. инженерные коммуникации – электроснабжение, водоснабжение, водоотведение. |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | Право аренды на земельный участок ООО «Дисвел плюс» не зарегистрировано |
| **Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации (руб.)** | Оплата расходов по оценке павильона, по публикации извещения в средствах массовой информации о проведении аукционов, плата за расчетно-кассовое обслуживание счета |
| **Условия продажи** | 1. Внесение победителем аукциона платы за продажу торгового павильона. 2. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения |
| **Срок приема заявлений на участие в торгах** | С момента публикации по 14 октября 2014 г. |

**Аукцион состоится 20 октября 2014 года в 11.00 по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 64 (малый зал).**

**Контактные телефоны в Малорите: (8-01651) 2-19-91, 2-22-08.**

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3012761272290 ЦБУ № 120 ф-ла 100 АСБ «Беларусбанк», МФО 150501246, г. Малорита, получатель платежа – ликвидационная комиссия ООО «Дисвел плюс», УНП 290484746.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Условием проведения аукциона является наличие не менее 2 участников.

**Заявления об участии в аукционе принимаются до 14 октября 2014 г. (включительно) по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 39, Малоритский райисполком, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень


**АВЕН.** Пажадана не займацца капаннем у сабе, каб у выніку не зведаць пачуцця расчаравання. Для дасягнення поспеху спатрэбяцца такія якасці, як засяроджанасць і ўпэўненасць у асабістых сілах. У чацвер лепш не пачынаць нічога новага, а ўсе важныя справы і сустрэчы перанесці на пятніцу.


**ЦЯЛЕЦ.** З'явіцца магчымасць зрабіць многа добрых спраў і дабіцца значных поспехаў на рабоце, але гэта не нагода для зазнайства. Пры жаданні і засяроджанасці на галоўных пытаннях зможаце дасягнуць добрых вынікаў і рэалізаваць практычна ўсё, што намецілі. Самым неэфектыўным днём можа аказацца панядзелак — не варта пачынаць нічога новага і пажадана захоўваць асцярожнасць ва ўсім.


**БЛІЗНЯТЫ.** Асцерагайцеся службовых раманаў: яны могуць загубіць кар'еру. Пажадана перагледзець свой стыль паводзін, магчыма — змяніць імідж. Панядзелак — адзін з самых плённых дзён тыдня, калі можна зрабіць значна больш, чым запланавана.


**РАК.** Фартуна на вашым баку, і вы можаце справіцца практычна з любой праблемай. Удача будзе спадарожнічаць у пачынаннях, звязаных з творчасцю. Папоўніце кола зносін прыемнымі і карыснымі для вас людзьмі. Перш чым прыняць сур'ёзнае рашэнне, пастарайцеся ўсё добра абдумаць.


**ЛЕЎ**. Адкладзіце дробныя справы, якія раздражняюць, і займіцеся вырашэннем больш важных праблем. Праявяцца вашы рознабаковыя таленты: аднолькава добра будуць удавацца як бытавыя, так і прафесійныя справы. Пастарайцеся не забывацца пра некаторыя правілы і праявіце рашучасць у пераадольванні цяжкасцяў.


**ДЗЕВА.** Будзьце больш уважлівымі да цікавых супадзенняў і дробных дэталяў, бо менавіта ў іх і будуць змяшчацца адказы на ўсе вашы пытанні. Серада — дзень, поўны ілюзій: адкладзіце прыняцце рашэнняў. Другая палова тыдня спрыяльная для пачатку рамонту ці іншых сур'ёзных перамен у доме.


**ШАЛІ.** Важна правільна спланаваць справы на тыдзень, каб не перарасходаваць сілы. Адчуўшы прыліў энергіі, не варта хапацца за некалькі спраў адразу — лепш спыніцца на чымсьці адным, найбольш значным для вас. На працы ўсё складваецца ўдала, у многіх справах вас чакае поспех і адчуванне асабістай незаменнасці.


**СКАРПІЁН.** Сумленнай працай вы па праву заваюеце ўвагу навакольных. Вас могуць падтрымаць аднадумцы і начальства, з'явіцца магчымасць паказаць свае здольнасці. Адмоўцеся ад асабістых амбіцый — гэта дазволіць захаваць час, сілы і нервы. Аўторак не лепшы дзень для прыняцця адказных рашэнняў, але спрыяльны для творчай працы.


**СТРАЛЕЦ.** У пачатку тыдня да вас можа падкрасціся праца: яна захопіць вас у палон, і вы трапіце ў вір першачарговых неадкладных спраў. Напружаны рытм тыдня можа паўплываць на працаздольнасць, а калі да абавязацельстваў, якія існуюць, дададуцца новыя, будзе цяжка з гэтым справіцца. Не ўцягвайцеся ў інтрыгі — гэта не дабавіць душэўнай раўнавагі.


**КАЗЯРОГ.** Прафесійная галіна запатрабуе пільнай увагі і непасрэднага ўдзелу. Дзеля таго, каб утрымліваць кантроль над сітуацыяй, спатрэбіцца разважлівасць і ўменне выконваць работу ў вызначаны тэрмін. Пастарайцеся ні з кім не сварыцца.


**ВАДАЛЕЙ.** Давядзецца адстойваць свой аўтарытэт і, магчыма, нават пацвярджаць кампетэнтнасць. Не адцягвайце ўвагі, рабіце сваю справу і дайце магчымасць іншым займацца сваімі пытаннямі. Цяпер неабходна працаваць на бліжэйшую будучыню, рэалізацыю і зацвярджэнне новых ідэй і планаў.


**РЫБЫ.** Нечаканыя сустрэчы і дзіўныя выпадкі пройдуць, як у калейдаскопе, і наўрад ці дадуць засумаваць. Лавіце ўдачу: выкарыстайце гэты час не толькі для забаў, але і па справе. Можаце пачуць нямала кампліментаў — многія будуць пераконваць вас у тым, што вы надзвычайная асоба. Не шкадуйце часу на зносіны і перамяшчэнні — усё будзе складацца цудоўна.

**Наблюдательный совет открытого акционерного общества «ДСТ № 2, г. Гомель»**
**сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 10 октября 2014 года**
**по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж (зал совещаний).**

**Повестка дня:**

1. О признании и утверждении результатов проведения закрытой подписки.
2. Об увеличении уставного фонда ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель».
3. О принятии и утверждении решения о дополнительном выпуске акций общества.
4. О внесении изменений в Устав ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель».

Начало собрания в 10.00.

Регистрация акционеров, их представителей с 9.00.

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, — 29 сентября 2014 г.

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям – доверенности.

УНП 400022426

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 31 октября 2014 г. ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ ПО ПРОДАЖЕ ЕДИНЫМ ПРЕДМЕТОМ ТОРГОВ ИМУЩЕСТВА, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708120685 общей площадью 1892,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 121А/9-3 (назначение – производственное помещение; наименование – помещение энергокорпуса (площадка № 2); Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708120683 общей площадью 9,5 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 121А/9-1 (назначение – складское помещение; наименование – кладовая). |
| **Сведения о продавце** | ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», г. Минск, ул. Казинца, 121А, к. 327 |
| **Сведения об организаторе торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 9 890 680 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 989 000 000 белорусских рублей |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) в течение 3 календарных дней со дня проведения торгов оплачивает организатору аукциона вознаграждение за его организацию и проведение, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере двух процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах аукциона. |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **31 октября 2014 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 06.10.2014 по 29.10.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36, (017) 327 40 22**
**(УП «Минский городской центр недвижимости»).**

## ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПРОВОДИТ АУКЦИОН
### по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 30.10.2014 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Аскрышино, участок № 1, кадастровый № 623288000601000028 | 0, 2500 га | Электроснабжение | 17 113 000 | 3 422 600 | 4 194 600 |
| 2 | Жабичи, участок № 5, кадастровый № 623288005101000022 | 0,2427 га | Электроснабжение | 19 221 800 | 3 844 400 | 5 255 173 |
| 3 | д. Стайки, участок № 2, кадастровый № 623288015101000040 | 0,2500 га | Электроснабжение | 14 784 000 | 2 956 800 | 5 187 550 |
| 4 | д. Стайки, участок № 3, кадастровый № 623288015101000042 | 0,2500 га | Электроснабжение | 14 784 000 | 2 956 800 | 5 187 550 |

*Задаток перечисляется на р/счет № 3600619171100 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

**Аукцион состоится 30.10.2014 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 25.10.2014 г. (последний день подачи заявления 24.10.2014 г. до 17.00) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.**

**Контактные телефоны: (801774) 57-4-35, 57-4-99.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
►**ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

### извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «СУКНО»

| Лот № 1 | Канализационная насосная станция и оборудование | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток с НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| | | **296 558 400** | **59 311 680** | **5** |

**ОПИСАНИЕ**

1. Канализационная насосная станция с инв. № 500/С-60383. Назначение – здание специализированное коммунального хозяйства. Год постройки – 1978. Этажей – 1. Подземных этажей – 1. Площадь застройки/общая – 91 м²/127,4 м². Фундамент – ж/б. Стены, перегородки – кирпичные. Перекрытия – ж/б плиты. Крыша – рулонная. Полы – бетонные, керамическая плитка. Проемы дверные – металлические, деревянные. Внутренняя отделка – оштукатурено, окрашено, частично облицовано плиткой. Отопление – центральное. Водопровод – подключение к квартальной водопроводной сети. Канализация – подключение к квартальной хоз.-фекальной канализационной сети. Электроснабжение – скрытая, открытая проводка. Горячее водоснабжение – централизованное. Вентиляция – естественная. Адрес: г. Минск, ул. Матусевича, 33/5.
2. Оборудование: - насос грязевой ФГ 144/46 ТУ-26-06-100, 1973 г.в. заводской № 2512; производительность – 144 м³/час, напор 46 м, КПД 64%; - насос грязевой ФГ 144/46 ТУ-26-06-100, 1973 г.в. заводской № 2513; производительность – 144 м³/час, напор 46 м., КПД 64%; - электродвигатель серии АИР 1973 г.в.; мощность 38 кВт, частота вращения – 1 450 об/мин.; - электродвигатель серии АИР 1973 г.в.; мощность 38 кВт, частота вращения – 1 450 об/мин.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 8,6900 га с кадастровым № 500000000006002163. Целевое назначение – эксплуатация и обслуживание административных и производственных зданий. Право постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав в использовании земель: охранная зона ливневой канализации, площадь 0,1159 га, 0,8302 га; охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,5506 га; охранная зона газопровода, площадь 0,2374 га; обеспечение доступа эксплуатационным организациям – владельцам инженерных коммуникаций для производства ремонтно-восстановительных работ, площадь 8,6900 га. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) - Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 5% (пяти процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен обеспечить в течение 3 (трех) месяцев после заключения договора купли-продажи проведение проектно-изыскательных работ, подготовку проектной документации, а также проведение строительно-монтажных работ по изменению существующей системы канализации ОАО «Сукно» без использования Объекта (здания канализационной станции). Все проектные и строительно-монтажные работы Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан проводить по согласованию с ОАО «Сукно».
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 31.10.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр.лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ.лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «СУКНО», **проводимом 31 октября 2014 г.**

Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни **с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений 29.10.2014 в 12.00.**

**Заключительная регистрация участников 31.10.2014 с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Борисевич Екатерина Игоревна 8 (044) 726-77-73, Апимахович Андрей Викторович 8 (044) 530-02-70.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**

■ Асабістае

# Верасень, які пахне драўнінай і сокам...



**Прыкладна кожныя два гады я з нецярпеннем (як той ганчак, што ўзбуджана ўцягвае носам паветра падчас палявання) і пэўным хваляваннем чакаю верасня. Аб прычыне апошняга раскажу потым, а нецярпенне абумоўлена нарыхтоўкай дроў у вёсцы ў маці. Справа ў тым, што, колькі сябе памятаю, люблю калоць дровы. Як па мне, дык няма найлепшага спосабу для падключэння да «нірваны» і «прачысткі мазгоў» пасля разумовай працы.**

ДАГЭТУЛЬ памятаю, як малым (мне, можа, гадоў пяць-шэсць было), гледзячы, як дарослыя мужчыны талакой нарыхтоўваюць дровы, прасіў, нават патрабаваў персанальныя калодку і сякерку. Такая любімая маленькая сякерка з'явілася крыху пазней. І мы разам з бацькам калолі дровы. Ён пасапраўднаму, а я побач дзёўб нейкія друзачкі. Вы б ведалі, колькі разоў сек сабе пальцы! Запомніўся выпадак, калі прыкладна вось такой парой (я быў недзе ўжо ў пятым класе) зноў калолі «разам» дровы. Маці па якойсьці прычыне дома не было. Бацька адышоў у хату. А я ў чарговы раз секануў сабе па руцэ... Кроў па пальцах сцякае, бягу ў дом і плачу. Але не ад болю, а з-за страху, што бацька адбярэ любімую сякерку — ужо колькі разоў абяцаў, калі паранюся...

Хто жыў у вёсцы, павінен памятаць, які гэта быў (цяпер часы іншыя, многія газ правялі) рэгулярны клопат — нарыхтоўка дроў. Выпісаць, часам яшчэ самому нарэзаць у лесе, прывесці, разгрузіць (уручную, вядома), парэзаць, пакалоць, скласці... Наконт прывезці таксама выпадак быў: тады ўжо вучыўся ва ўніверсітэце. Выпісалі ў знаёмага лесніка трактар дроў самавывазам — каб танней было. Дамовіўся даўжыні, шмат таўшчэзных, якія даводзілася потым пераколваць. Складваць іх таксама нязручна. У адзін з мінулых разоў прывезлі машыну амаль што спрэс дуплаватых. З такіх калодак, дарэчы, неблагія кашпо пад кветкі для ўпрыгажэння ўчастка атрымліваюцца. Таму дровы даводзіцца шукаць, часцей — у прадпрымальнікаў. І самі дровы больш якасныя, і табе мала таго што прывязуць іх, дык яшчэ маніпулятарам тыя ствалы метраў па шэсць акуратна цераз агароджу пакладуць на ўчастку. Дарогу не займаюць, перацягваць самому іх таксама не трэба. Але ты яшчэ паспрабуй таго прадпрымальніка знайсці! Участак у нас невялікі, дровы трэба заказваць або пакуль яшчэ холадна (у сакавіку), каб паспець іх прыбраць да градак, або як толькі знялі ўраджай, але яшчэ «белыя мухі» лятаць не пачалі, бо агарод жа яшчэ ў парадак трэба прывесці (у верасні-кастрычніку). Неяк аднойчы купілі дровы ў жніўні. Быў водпуск, цёпла, іх можна было калоць і складваць не спяшаючыся — у сваё задавальненне. Але ж градкі былі яшчэ не ўбраныя, таму давялося «паскакаць» на невялічкім «пятачку»: парэзаныя дровы занялі амаль усю свабодную прастору, таму калолі і складвалі іх дробнымі партыямі.



Вось яны, «царскія» дровы!

наконт тэхнікі, паклікаў на дапамогу некалькіх сяброў. Як мы тыя таўшчэзазныя і неймаверна цяжкія ствалы бяроз у прычэп грузілі — дагэтуль памятаю...

ЗДАЕЦЦА, яшчэ зусім нядаўна рэзалі дровы ўсім вядомай «Дружбай-2» — двухручнай пілой. Але напачатку яе трэба было падрыхтаваць. Памятаеце, як у «Цёркіне»? «...Поищи-ка, дед, разводку,/ Мы ей сделаем развод./ Посмотреть — и то отрадно:/ Завалящая пила/ Так-то ладно, так-то складно/ У него в руках прошла./ Обернулась — и готово./ — На-ко, дед, бери, смотри./ Будет резать лучше новой,/ Зря инстрУмент не кори.» Калі дровы былі не вельмі тоўстыя, справа рухалася даволі хутка, хоць праца тая не вельмі лёгкай была. А вось калі трапляліся добрыя камлі... У такіх выпадках стараліся наняць каго з бензапілой. І хутчэй, і для здароўя ўласнага лепш. Гэта зараз нікога не здзівіш рознымі «Штылямі» і «Хускварнамі» — хоць электрычнымі, хоць на бензіне. У брата таксама «шведка». Лесавоз дроў (кубоў на 9) «кладзём» удвух гадзіны за чатыры-пяць. Праўда, гэта толькі лічыцца, што рэжам, насамрэч цуркі трэба яшчэ адкідваць, складваць, а ствалы «варушыць», падцягваць. Таму так накідаешся і нацягаешся, што, лічы, у першы ж дзень яшчэ і «пакалоў» іх...

Сам у рукі бензапілу не бяру — рэжа выключна брат. Я ўвогуле параўнальна нядаўна зноў прызвычаіўся да яе гуку і выгляду шыны з ланцугом у рабоце. Быў выпадак, калі мне толькі споўнілася 14 гадоў... Тады бензапілы (як у фільме «Дзяўчаты», памятаеце?) былі далёка не ва ўсіх. Папрасілі дапамагчы суседа. Ён рэзаў, я адкідваў цуркі. У нейкі момант сусед нападпітку пахіснуўся... Піла прайшлася па правым баку ад пляча да сцягна. Хто бачыў ланцуг бензапілы, ведае, што ён пакідае прапіл шырынёй каля сантыметра... Рэзкі ўдар — і я змог сам на сабе колькі секундаў разглядаць анатомію пляча, пакуль дзіркі не запоўніліся крывёй.

ЗАКАЗАЦЬ дровы не так проста і цяпер. Спрабавалі браць у гарпаліве — хоць рэзаныя, хоць і колатыя ўжо, але рэдка былі задаволены, таму гэты варыянт трымаем звычайна як запасны. Рознай

Пры заказе шмат залежыць ад надвор'я, бо бывае так, што прадпрымальнікі ЯШЧЭ дровы не возяць, а праз нейкі час — УЖО не возяць. Напрыклад, хутка пацяплела і цяжкая тэхніка ўжо не можа прайсці па лясных дарогах. Ці прадпрымальнік ужо асвоіў атрыманую дзялянку — і ўсё, чакай да наступнага сезона... Сёлета дровы заказалі аж у Магілёўскай вобласці (у наш Чэрвеньскі раён). Але якія? «Царскія»: дзве таўшчэзныя бярозы, дзве елкі, а астатняе — вольха! Дровы з вольхі жару даюць не нашмат менш, чым з бярозы, але ачышчаюць комін ад сажы, асабліва пасля смалістых дроў. І калоліся яны таксама «па-царску». Пакуль не ўвайшоў у рытм, з асцярогай браў сукаватыя цуркі. Але паспрабаваў раскалоць адну, другую — «ішлі», як і не сукаватыя! Тады ўжо браў з кучы без разбору.

**Паднімаеш з пераваротам цурку на плячо, прыўздымаешся на дыбачкі — і з усяе сілы апускаеш абух сякеры з «нанізанай» цуркай на калодку. Бух! Расколатыя палавінкі з трэскам разлятаюцца ў бакі. Дзынь, наўздагон ім кажа сякера.**

У НАС з братам розныя спосабы калоць дровы. Ён аддае перавагу калуну, я — сякеры, г.зн. у яго цурка нязменна застаецца на калодцы, я ж кідаю яе праз плячо аб тую самую калодку (хаця, калі трэба, і я калун у рукі бяру). Нейкім навамодным сякерам не вельмі давяраю. Можа, праўда, дарэмна, але што ёсць, тое ёсць. Няхай сабе прадаўцы на таіх вачах скачуць па доўгім тапарышчы, дэманструючы яго гнуткасць і трываласць. Як па мне, дык такімі сякерамі, як у амерыканскіх фільмах, калоць толькі каліброваныя кароткія цуркі на дровы для каміна. Для печы дровы патрэбны даўжэйшыя, а самі цуркі, як казаў, бываюць не толькі без сукоў. Некалькі гадоў таму на рынку набыў сабе сякеру, якой вельмі задаволены. Год выпуску — 1951-ы, значыць, зрабілі яе яшчэ пры жыцці Сталіна. І зрабілі сумленна! Прадаўцы казалі, што гэта лішкі ваеннай маёмасці яшчэ з савецкіх часоў.

**...Колем, складваем дровы з ранку да вечара, а потым збіраем, мыем, рэжам яблыкі на двары — літаральна пад святлом вулічнага ліхтара. Хрусцяць і пырскаюцца сокам на рукі і твар ужо не цуркі, а плады.**

Якая б стома ні брала (а мышцы ў першы дзень працы вой як пачынаюць балець, на што брат нязменна гаворыць: «Баляць, значыць, растуць!»), раскалоць хаця б колькі цурак — святая справа. А як інакш?! Гэта як разабраць свінню і не пакаштаваць свежыны... Сякеру — на колькі часу ў вядро ці бочку з вадой: гэта ж не цяслярскі інструмент, доўгі час быў без працы, трэба, каб тапарышча крыху разбухла. Ставіш загадзя падрыхтаваную свежавыразаную калодку, выбіраеш першую цурку. Замах, удар! Невялікая цурка разлятаецца папалам адразу. А бывае, што ледзь падымеш каторую... Удар! З-пад сякеры выступае сок ад свежай драўніны. Значыць, дастаткова кінуць яе праз сябе хаця б адзін раз — абавязкова расколецца. Паднімаеш з пераваротам цурку на плячо, прыўздымаешся на дыбачкі — і з усяе сілы апускаеш абух сякеры з «нанізанай» цуркай на калодку. Бух! Расколатыя палавінкі з трэскам разлятаюцца ў бакі. Дзынь, наўздагон ім кажа сякера. Падымаеш адну з палавін цуркі, зноў ставіш на калодку. Замах, удар — «разлёт нармальны»...

ПАСЛЯ працяглага рыку бензапілы, калі яна змаўкае, адчуваеш, наколькі ты аглух. Потны, прапахлы выхлапнымі газамі ад яе, увесь у пілаванні садзішся ненадоўга перадыхнуць. У паветры востра пахне свежым дрэвам. Цуркі вольхі, парэзаныя першымі, на зрэзах на сонцы ўжо набылі жаўтавата-чырванаватую афарбоўку. Апошнія, парэзаныя толькі што, бялеюць побач... Пакуль сядзіш і курыш, кот напачатку сам залазіць табе на калені, а потым перабіраецца на карак і выцягваецца там, раз-пораз паводзячы носам у бок запаленай цыгарэты ў руцэ, калі падносіш яе да вуснаў. Колькі гадоў таму ён самастойна выканаў гэты трук з карасканнем на шыю і з таго часу нязменна паўтарае яго, як толькі мы пачынаем пілаваць і калоць дровы. Магчыма, яму таксама падабаецца гэтае спалучэнне пахаў у паветры: поту, гары, свежага пілавіння? І водару яблыкаў, якія — ты чуеш, як толькі пакрысе аднаўляецца слых — глуха падаюць за дровамі і на дровы з дрэва.

ВОСЬ гэтыя яблыкі і ёсць крыніца згаданага ў самым пачатку хвалявання. Ураджай здараецца раз на два гады — якраз тады, калі даводзіцца нарыхтоўваць дровы. А часу ж нестае, бо шчыраваць выпадае толькі па выхадных. Тут бы з гэтым клопатам справіцца: дровы ж трэба потым скласці, убіты агарод пераараць, іншыя восеньскія работы зрабіць. Але ж і яблыкаў шкада! Сок з іх атрымліваецца кісла-салодкі, вельмі смачны. Таму ўжо каторы раз у нас такая завядзёнка: колем, складваем дровы з ранку да вечара, а потым збіраем, мыем, рэжам яблыкі на двары — літаральна пад святлом вулічнага ліхтара. Хрусцяць і пырскаюцца сокам на рукі і твар ужо не цуркі, а плады. Праца манатонная, таму часам пачышчаныя скрылькі яблыка ляцяць не ў тую ёмістасць... Сок ціснем часам да поўначы. І добра, калі ўсяму працэсу надвор'е спрыяе. Бо калі непагадзь і мыеш яблыкі ў вадзе з калонкі, рукі заходзяцца ад холаду і дзервянеюць за хвіліны. Але потым нічога, сцюдзёная вада здаецца нават цёплай: толькі паспявай, мый. Супынішся на хвіліну, каб спіну выпрастаць, і пачуеш над галавой цяжкія ўзмахі крылаў. Гэта, відаць, каршун вяртаецца з боку ракі ў лес, трымаючы ў кіпцюрах здабычу. У паветры пахне спаленым бульбянікам...

Памыўшы ногі абавязкова халоднай вадой і пераапрануўшыся ў сухое і чыстае, ідзеш да стала, да позняй вячэры. Нязграбнымі рукамі згортваеш гарачы бульбяны блін (не дранік!) і мачаеш яго ў патэльню з яечняй на сале, выбіраючы «вочкі» з янтарнага колеру тлушчам, перамешаным з густой смятанай. Відэльцам падчэпліваеш кавалачак смажанкі... І хмялееш яшчэ да заслужанай чаркі. Ад цяпла дома, ад смакаты ў роце, ад стомы ўсіх мышцаў. Сон прыходзіць імгненна.

...А з ранку — зноў сякеры ў рукі. І так усе выхадныя, пакуль не прыбраныя апошнія палена і яблык. Такой восень потым усю зіму і помніцца: з пахам свежай драўніны і свежавыціснутага яблычнага соку...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## ПАКАШТУЙЦЕ

### Балгарскі бульбянік



*Спатрэбіцца: бульба — 500 г, брынза — 250 г, цыбуля — 1 шт., яйкі курыныя — 2 шт., перац чорны (на смак), мята (некалькі лісцікаў), мука — 2 ст. л., алей (для смажання).*

Бульбу надзерці на буйной тарцы. Дабавіць яйка, надзёртую на дробнай тарцы цыбулю. Дадаць здробненую (можна рукамі або на тарцы) брынзу, свежамолаты перац, здробненую мяту, муку.

На патэльню дыяметрам 20 см наліць алей, разагрэць, выкласці палову бульбяна-сырнай масы, накрыць вечкам і смажыць на слабым агні да падрумяньвання з аднаго боку. Затым накрыць талеркай, перавярнуць, перакласці бульбянік назад на патэльню, смажыць да гатоўнасці. Тое ж самае паўтарыць з другой часткай масы.

### Баклажанны «торт»



*Спатрэбіцца: баклажаны — 5 шт., перац балгарскі (чырвоны) — 4 шт., кунжутная паста — 2 ст. л., соевы соус — 3 ст. л., смятана — 2 ст. л., часнок — 3 зубкі, арэхі грэцкія — 1/2 шклянкі.*

Тры баклажаны запячы ў духоўцы да мяккасці. Перац памыць, пачысціць, нарэзаць на кавалачкі і абсмажыць у алеі. Калі іх запячы з баклажанамі у духоўцы, страва будзе менш каларыйнай.

Два вялікія баклажаны нарэзаць доўгімі «языкамі», абсмажыць з двух бакоў у алеі. Грэцкія арэхі здрабніць.

Гатуем соус. У місцы злучаем ачышчаныя ад скуркі печаныя баклажаны, кунжутную пасту (тахіні), смятану, алей і соевы соус (мінімум 3 ст. л). Дабаўляем здробненыя грэцкія арэхі і часнок. Пры дапамозе блендара ператвараем усё ў аднастайную масу. Солім і перчыць на смак. Цяпер складаем «торт». Ніжнім слоем выкладваем баклажаны, зверху — баклажанна-арэхавую пасту. Наступны слой — смажаны перац. На перац выкласці пасту, накрыць слоем баклажанаў. Торт упрыгожыць смажаным перцам і зяленівам. Можна падаваць адразу на стол. Гэтая страва асабліва смачная на наступны дзень. Паста застыне, і «торт» будзе наразацца на роўныя кавалкі.

## УМЕЛЫЯ РУЧКІ

### Упрыгажэнне на шыю са звычайнага мужчынскага гальштука



**Калі вы любіце быць у цэнтры ўвагі ці не баіцеся смелых эксперыментаў і аддаяце перавагу яркім неардынарным рэчам, то гэта для вас.**

Нам спатрэбіцца: мужчынскі гальштук, гузік.

Прыбіраем усе біркі (яны нам не патрэбны, бо створаць лішнюю таўшчыню). Вызначаемся з даўжынёй будучага ўпрыгажэння і з дапамогай кравецкіх шпілек робім складкі, фарміруючы паўкруг. Зараз неабходна зафіксаваць складкі. Гэта можна зрабіць уручную іголкай з ніткай або з дапамогай швейнай машынкі. Перад тым, як сшываць два канцы дэталі паміж сабой і прышываць дэкаратыўны гузік, упрыгажэнне варта адпрасаваць.

## ХАТНІ МАЙСТАР

### НЕАБХОДНЫ МІНІМУМ ІНСТРУМЕНТАЎ

**У кожным доме павінен быць набор самых простых і патрэбных інструментаў для таго, каб у любы момант выканаць розныя рамонтныя работы. Што ж уваходзіць у гэты набор?**

✓ Адвёрткі розных відаў: крыжовыя, звычайныя плоскія. Іх павінна быць некалькі памераў: ад самых маленькіх да досыць вялікіх. Для выпадкаў рамонту электраабсталявання неабходныя адвёрткі з дыэлектрычнымі рукаяткамі.

✓ Малаток. У надзейнага і якаснага інструмента баёк трывала трымаецца на ручцы, не хістаецца. Матэрыял ручкі адпаліраваны і пакрыты лакам. У камплект да малатка неабходна набыць цвікі рознага памеру.

✓ Абцугі (пласкагубцы). У якаснага інструмента надзейна ізаляваныя ручкі для прадухілення удараў токам пры рабоце з правадамі.

✓ Ключы: разводныя, гаечныя. Велізарны набор ключоў розных памераў можна замяніць адным універсальным разводным ключом.

✓ Хатні партатыўны электрадрыль спатрэбіцца для дробнага ці сярэдняга рамонту. Можна выбраць інструмент з пашыраным функцыяналам: з магчымасцю падлучэння шліфавальных насадак, з ударнай сілай.

Акрамя ўсіх пералічаных прыстасаванняў, не лішнім будзе запасціся расходным матэрыялам: клеем, ізаляцыйнай стужкай, растваральнікам, сіліконам або сіліконавым герметыкам, дротам.

НАРОДЖАНЫЯ 27 верасня

**Гэтыя людзі звычайна дзейнічаюць дакладна і арганізавана (асабліва тады, калі за імі назіраюць навакольныя). Але, тым не менш, імі могуць авалодаць сумненні і перасцярогі. Яны зашмат чакаюць ад сябе, і таму часта імі можа апанаваць дэпрэсія з-за няздольнасці вырашыць недасягальныя задачы, якія яны паставілі перад сабой. Няўдачы і поспех з'ўляюцца пастаяннымі тэмамі ў іх жыцці. У час крызісаў яны адчуваюць патрэбу ў падтрымцы добрага сябра ці члена сям'і і парадзе, якія б нагадалі ім аб іх несумненных станоўчых рысах і дапамаглі жыць у згодзе з самім сабой.**

НАРОДЖАНЫЯ 28 верасня

**Яны валодаюць незвычайным шармам, які здольны растапіць самае халоднае сэрца і адагрэць кроў. Акрамя таго, яны валодаюць талентам рабіць людзям балюча, які кантрастуе са здольнасцю быць прыемнымі. Сустракаючы пэўнае супраціўленне, яны ніколі не адступаюць, таму што першапачаткова настроены на пераадоленне цяжкасцяў рознага кшталту. Яны паважаюць прыгажосць, адчувальных і пачуццёвых людзей, высокае мастацтва, незвычайныя прыродныя з'явы, і, калі сустракаюцца з такімі феноменамі, забываюцца на ўсё і на ўсіх. У асабістым жыцці яны могуць стаць надзейнымі членамі сям'і і адказнымі бацькамі.**

## Даты | Падзеі | Людзі

***Сусветны дзень турызму. Заснаваны на сесіі Генеральнай асамблеі Сусветнай турысцкай арганізацыі ў 1979 годзе.***





**1533** год — нарадзіўся (Румынія) Стэфан Баторый, дзяржаўны дзеяч, палкаводзец, вялікі князь літоўскі, кароль польскі. У 1576 годзе абвешчаны вялікім князем літоўскім. У 1579-1582 гг. узначальваў войскі Рэчы Паспалітай у Лівонскай вайне 1558-1583 гадоў. Імкнуўся да ўмацавання каралеўскай улады, разам з тым падтрымліваў шляхту. Прывілеем ад 1 красавіка 1579 года ператварыў Віленскі езуіцкі калегіум у акадэмію (пазней — Віленскі ўніверсітэт), даў дазвол на заснаванне езуіцкага калегіума ў Полацку, ініцыяваў стварэнне езуіцкага калегіума ў Гродне, дзе знаходзілася адна з каралеўскіх рэзідэнцый. Гродна ў часы яго кіравання фактычна з'яўлялася сталіцай дзяржавы. Тут кароль і памёр у 1586 годзе.

**1909** год — 105 гадоў таму нарадзіўся (вёска Скварцы, цяпер Дзяржынскі раён) Лукаш Калюга (Канстанцін Пятровіч Вашына), беларускі пісьменнік. У 1931 годзе скончыў Беларускі педагагічны тэхнікум. Працаваў у НДІ прамысловасці ВСНГ Беларусі, на Беларускім радыё. Аўтар аповесцяў «Ні госць, ні гаспадар», «Нядоля Заблоцкіх», апавяданняў. Шырока выкарыстоўваў сродкі сатыры і гумару. На беларускую мову пераклаў асобныя творы П. Панча, Ю.Алешы, Я. Гашака. У 1933 годзе рэпрэсаваны. Расстраляны ў 1937-м. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

**1939** год — 75 гадоў таму нарадзіўся (вёска Хмельнае Буда-Кашалёўскага раёна) Уладзімір Кірылавіч Саўчанка, вучоны ў галіне генетыкі, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1989), доктар біялагічных навук (1977), прафесар (1987). У 1962 годзе скончыў Беларускі тэхналагічны інстытут. У 1980-1990 гг. старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта па праграме ЮНЕСКА «Чалавек і біясфера». У 1990-2002 гадах — галоўны праграмны спецыяліст сектара прыродазнаўчых навук ЮНЕСКА, у 2003-2007 гг. — галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі. Аўтар больш як 280 навуковых прац, у тым ліку 12 манаграфій, 3 вынаходак. Навуковыя даследаванні ў галіне агульнай біялогіі, генетыкі і экалогіі. Распрацаваў метады генетычнага аналізу і сінтэзу поліплоідных папуляцый. Арганізаваў Міжнародную чарнобыльскую экалагічную навуковую сетку ЮНЕСКА для міждысцыплінарных даследаванняў экалагічных наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984).

### Было сказана

**Саламея РУСЕЦКАЯ, першая ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага прафесійная жанчына-доктарка, мемуарыстка:**

*«Я таму карысталася поспехам у людзей, што пачалавечы абыходзілася з імі і вельмі імкнулася, каб дасканала сваё рамяство ведаць».*

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.04 | 18.56 | 11.52 |
| Віцебск — | 6.53 | 18.46 | 11.53 |
| Магілёў — | 6.54 | 18.46 | 11.52 |
| Гомель — | 6.50 | 18.43 | 11.53 |
| Гродна — | 7.19 | 19.12 | 11.53 |
| Брэст — | 7.19 | 19.13 | 11.54 |

**Месяц**

***Маладзік 24 верасня.***

***Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

**Імяніны**

***Пр.*** *УЗВІЖАННЕ (Узвышэнне Крыжа Гасподняга).*

***К.*** *Мірабэлы, Вінцэнта, Дамяна, Космы.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА





**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +15..+17°C | КІЕЎ +15..+17°C | РЫГА +15..+17°C |
| ВІЛЬНЮС +14..+16°C | МАСКВА +14..+16°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +12..+14°C |

## УСМІХНЕМСЯ

**По лысым электрыку незразумела, калі ён памыляецца.**

Жонка збіраецца на дзявочнік: прычасалася, нафарбавалася, апранулася. Пытаецца ў мужа:

— Ну, як я выглядаю?

— Ты выглядаеш так, што цяпер дома застанешся!

**Калі ў нас адключылі гарачую ваду, то ў маёй сям'і з пяці чалавек чайнік стаў на вагу золата.**

Фраза «Я сын пракурора» так і не змагла адпудзіць мядзведзя.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 19.983. Індэкс 63850. Зак. № 3908.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 верасня 2014 года.